Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
26 ліпеня 2023 г.
СЕРАДА
№ 142 (30022)
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ



НА ПРЫЁМ ДА СТАРШЫНІ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ 7-8



ГЕРОЙ БЕЛАРУСІ АДЗНАЧЫЎ ЮБІЛЕЙ 3

# НА ВЫШЫНІ





У Мінску вядзецца капітальны рамонт з мадэрнізацыяй пуцеправода праз чыгунку па вуліцы Запарожскай. Работы выконвае філіял «Мостабудаўнічае ўпраўленне № 6 ААТ «Мостабуд».

Бетоншчык Уладзімір ЛАЗАРКОЎ асвоіў спецыяльнасці стропальшчыка і мантажніка. На прадпрыемстве ён працуе каля пяці гадоў і карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у калег і кіраўнікоў.

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**

## ЛІЧБА ДНЯ

**На 15,2 працэнта**



*ўзрасла ў чэрвені сярэдняя заработная плата ў Беларусі. Па выніках мінулага месяца яна дасягнула Br1927,1, паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі. У рэальным выражэнні па выніках першага паўгоддзя сярэдні заробак павялічыўся на 7,4 працэнта. Самая высокая сярэдняя заработная плата ў Мінску — Br2598. У Мінскай вобласці яна склала Br1920,8, у Гомельскай — Br1751,9, Гродзенскай — Br1734,8, Брэсцкай — Br1696,1, Віцебскай — Br1657,3 і Магілёўскай — Br1609, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.*

## КОРАТКА

• Зернесушыльны комплекс праектнай гадавой магутнасцю 16 тыс. тон адкрылі ў Сенненскім раёне.

• **На БМЗ укаранілі новую тэхналогію вытворчасці блюму.**

• Больш за сто ратавальнікаў прынесла прысягу ў адукацыйным цэнтры МНС у Мінску.



ISSN 1990 — 763X
23142
9 771990 763008

Соцыум

## І нарадзілі, і пашану заслужылі

**Алена ДЫШЛЕВІЧ з аграгарадка Гайна Лагойскага раёна прадстаўлена да ўзнагароджання Ордэнам маці. Алена і яе муж Уладзімір выхоўваюць пяцярых дзяцей. Усе хлопчыкі.**



Фотаздымкі Аляксандра КЛІМАЎЦА.

СТАР. 5

Вяртанне спадчыны

## Антычнасць, ляпніна, фрэскі

### У Старым замку Гродна завяршыўся першы этап рэканструкцыі каралеўскай рэзідэнцыі



**Алебастравая зала стала заключным акордам маштабных аднаўленчых работ. Памяшканне адкрылася для наведвальнікаў літаральна нядаўна, хоць меркавалася адкрыць яго разам з каралеўскай лазняй і пакоем чыноўніка некалькі месяцаў таму. Але пры ўваходзе ў залу становіцца зразумела — давесці да канца такую работу было зусім не проста.**

СТАР. 12

ІГАР СЕРГЕЕНКА:

# «ГАЛОЎНАЕ — УМЕЦЬ ЧУЦЬ, СЛУХАЦЬ, ДАПАМАГАЦЬ МОЛАДЗІ»

**Галоўнае ў рабоце з моладдзю — умець чуць, слухаць, дапамагаць, своечасова рэагаваць на канструктыўныя ініцыятывы і садзейнічаць іх рэалізацыі. Аб гэтым пасля пасяджэння Гродзенскага гарвыканкама «Аб эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў арганізацыях Гродна» заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА, паведаміла БелТА.**

Адказваючы на пытанне аб важнасці работы з моладдзю, Ігар Сергеенка адзначыў, што калі не працаваць сёння, то заўтра будзе значна складаней. «Тым больш наша моладзь даволі актыўная. Маладыя людзі, прадстаўнікі БРСМ, выказвалі цікавыя прапановы, на якія варта звярнуць увагу і з пазіцыі рэспубліканскіх органаў кіравання разгарнуць, напоўніць зместам. Галоўнае — умець чуць, слухаць, дапамагаць моладзі, своечасова рэагаваць на канструктыўныя ініцыятывы, садзейнічаць іх рэалізацыі», — сказаў ён.

«У Гродне сфарміравана сістэма работы ў маладзёжнай палітыцы. Моладзь тут — немалая сіла: каля 20 працэнтаў (больш за 71 тысячу маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года). Гарвыканкамам праводзіцца работа з адміністрацыямі, калектывамі прадпрыемстваў, навучальнымі ўстановамі», — дадаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка падкрэсліў важнасць закранутых на пасяджэнні пытанняў, абмеркаванне якіх будзе садзейнічаць удасканаленню работы з моладдзю. «Разглядаліся такія тэмы, як выхаванне моладзі на гераічных і патрыятычных традыцыях беларускага народа, пытанні працаўладкавання маладых людзей (як непаўналетніх у час школьных канікулаў, так і студэнтаў ВНУ ў студэнцкіх атрадах), працаўладкавання і замацавання маладых кадраў, рэалізацыя новых



праектаў, павышэнне ролі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Спектр тэм даволі разнастайны, ёсць над чым працаваць», — рэзюмаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

У Гродне на працягу мінулага навучальнага года прайшлі 369 «Школ актыўнага грамадзяніна», у якіх узяло ўдзел каля 11 тысяч маладых людзей. У горадзе рэалізоўваецца праект — ток-шоу «Класнае пытанне», гарадскі патрыятычны фестываль-конкурс «Гісторыя краіны ў песнях», які аб'яднаў амаль 1,2 тысячы вучняў. Адноўлены міжнародныя «Карбышаўскія чытанні» ў СШ № 15. Маладыя гродзенцы, дарэчы, атрымлівалі ганаровае званне «Чалавек года Гродна». У абласным цэнтры дзейнічае больш за 40 ваенна-патрыятычных клубаў, якія аб'ядноўваюць 670 вучняў, а таксама працуюць цэнтры патрыятычнага выхавання. Ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі Гродна функцыянуюць 41 музей і 19 музейных кабінетаў (тром школьным музеям прысвоена званне народнага). У Гродзенскай вобласці ўжо адпрацавалі 3,5 тысячы чалавек у складзе студэнцкіх атрадаў. Сфарміравана 7,5 тысячы працоўных месцаў. Студэнцкія атрады вобласці працуюць на тэрыторыі Гродна, усёй краіны і за мяжой.

Меркаванне

# «Сутнасць — апора на ўласныя сілы»

**Падчас афіцыйнай сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу былі разгледжаны актуальныя пытанні ў сферы эканомікі, бяспекі і геапалітыкі. За выказваннямі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна без перабольшвання сочыць увесь свет. Пракаментавалі вынікі візіту беларускага лідара ў Расію і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**



**Валянцін БАЙКО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**

«Зачыстка эканамічнай прасторы ад непажаданых канкурэнтаў можа быць рэальнай мэтай чарговай часткі санкцыйнага серыяла. Што павінна рабіць Беларусь у такой сітуацыі?

На сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі было адзначана, што цяпер як ніколі краіна павінна прадаўжаць працаваць над умацаваннем свайго суверэнітэту, нарошчваць эканамічны патэнцыял, развіваць нацыянальны бізнес і інтэнсіўна наладжваць інтэграцыйныя працэсы ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Цеснае супрацоўніцтва палепшыць эканамічныя магчымасці Беларусі і Расіі, а таксама дабрабыт шматтысячных працоўных калектываў абедзвюх краін».



**Марына ІЛЫНА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

«У рамках сустрэчы дадзена негатыўная ацэнка агрэсіўнай палітыкі Рэспублікі Польшча ў адносінах да Рэспублікі Беларусь як складніка Саюзнай дзяржавы, выпрацаваны далейшыя дзеянні па забеспячэнні бяспекі Саюзнай дзяржавы як у эканамічнай, так і ваеннай сферы. Жыхары Санкт-Пецярбурга віталі лідараў Беларусі і Расіі і падчас гутаркі падтрымалі праводзімую палітыку ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Далейшае паляпшэнне эканамічнага супрацоўніцтва і ўмацаванне абараназдольнасці ў рамках Саюзнай дзяржавы будзе садзейнічаць развіццю Беларусі і Расіі на перспектыву».



**Каліна КАПУЦКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

«Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі прайшла без гальштукаў, а гэта значыць, што ўзровень узаемнага даверу двух лідараў як ніколі высокі. Акрамя таго, гутарка мела канструктыўны характар і зусім не была падобная на фармальную ці проста афіцыйную размову.

Трэба адзначыць значнасць сустрэчы і неабходнасць публічнасці ў ацэнцы ваенна-палітычнага становішча вакол Саюзнай дзяржавы расійска-беларускім бокам. Важна, каб і беларускі, і польскі, і украінскі народы разумелі, да чаго могуць прывесці такія неабдуманыя і ваяўнічыя дзеянні, якія адбываюцца каля нашых граніц.

Аляксандр Лукашэнка — дальнабачны палітык, і яго гаворка пры сустрэчы з расійскім калегам была напоўненая сэнсамі, фактамі і прапановамі, у эфектыўнасці якіх цяжка ўсумніцца. Наш Прэзідэнт адкрыта гаворыць аб узаемадзеянні ў сферы абароны і бяспекі, аб неабходнасці цеснага эканамічнага супрацоўніцтва ва ўмовах санкцый і ціску з боку Захаду, аж да падрыхтоўкі стратэгічнага плана і яго паэтапнай рэалізацыі.

Мы разумеем, што ўсе тэмы, закранутыя прэзідэнтамі ў Санкт-Пецярбургу, адпавядаюць спрадвечным інтарэсам беларускага народа і вельмі важныя ў гэты няпросты перыяд нашай гісторыі».



**Віктар ЛІСКОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

«Наш Прэзідэнт на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі ў сваім уступным слове закрануў многія пытанні, уключаючы ход спецыяльнай ваеннай аперацыі, адсутнасць вынікаў ад контрнаступлення УСУ, узмацненне ваеннай актыўнасці НАТА ў Польшчы. Але самая важная тэма, якую агучыў Аляксандр Рыгоравіч, — планы па развіцці эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі.

«Я хацеў бы папрасіць яшчэ раз, каб нашыя ўрады прадумалі план эканамічны. Я запісаў сабе сутнасць — апора на ўласныя сілы», — сказаў Прэзідэнт нашай краіны. Ён дадаў, што ў Расіі і Беларусі «мазгоў хапае, а рэсурсаў больш чым дастаткова».

Мы бачым, што палітычныя падзеі, якія адбываюцца цяпер, падштурхоўваюць Беларусь і Расію да яшчэ большага збліжэння, сумеснага эканамічнага росту, выхаду на новыя рынкі, стымулююць стварэнне новых імпартазамяшчальных вытворчасцяў, гартуюць эканомікі нашых краін, павышаюць запатрабаванасць і канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі на сусветных рынках.

І гэтыя словы Прэзідэнта павінны стаць для нас усіх арыенцірам у далейшай дзейнасці. Яны нам чарговы раз нагадваюць аб тым, што трэба разлічваць толькі на сябе, на свае сілы і рэсурсы, а таксама на брацкі нам народ Расіі.

У сувязі з гэтым магу з упэўненасцю сцвярджаць, што прапанова Аляксандра Рыгоравіча вельмі своечасова, дакладна і адназначна прывядзе да новых эканамічных узаемаадносін, вытворчасцяў, прадуктаў, карысці для двух дзяржаў і адноснай незалежнасці ад еўрапейскай эканомікі».



**Аляксандр ЛЯХАЎ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

«Сустрэча лідараў Беларусі і Расіі ў чарговы раз паказала адзіную думку па большасці пытанняў, у тым ліку стратэгічных.

Было яшчэ раз адзначана ўзмацненне ваеннай актыўнасці НАТА каля граніц нашай дзяржавы. І ў такім кантэксце вельмі важнай была заява Уладзіміра Пуціна аб гарантыях бяспекі Беларусі з боку Расіі. Так проста і дакладна гэта прагучала на вышэйшым узроўні ўпершыню.

Мне як кіраўніку буйнога прадпрыемства, якое мае не толькі цесныя сувязі з Расіяй, але і цэлы кластар у Заходняй Сібіры, вельмі важна было пачуць аб планах па развіцці эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. Як справядліва падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, і нам, і расіянам трэба арыентавацца на свае сілы і на сябе. Добрыя парасткі ўжо заўважныя ва ўсіх сферах».



**Юрый НАРКЕВІЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

«Чарговы раз у ходзе сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу былі ўзнятыя тэмы бяспекі, эканомікі, санкцыйнага супрацьстаяння. Па ўсіх тэмах, што немалаважна для грамадзян двух краін, палітыкі гаварылі адкрыта. Было дакладна адлюстравана, што краіны пачалі ўжо працаваць у такіх сферах, як мікраэлектроніка, сельская гаспадарка. Падчас сустрэч выразна пазначана: «Эканоміка — гэта аснова».



**Алег РАМАНАЎ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:**

«Мы поўнасцю падтрымліваем кіраўніка дзяржавы ў ідэі аб тым, што рэгіяналізацыя і інтэграцыйныя саюзы сёння — неабходная ўмова выжывання краін. Рэспубліка Беларусь у дадзеным сэнсе была лакаматывам, бо менавіта наш Прэзідэнт адным з першых пачаў казаць аб неабходнасці стварэння і прасоўвання такога кшталту супольнасцяў.

Глабалізацыя аказалася ідэалагічным міфам, які дастаткова актыўна ўкараняўся ЗША і іх саюзнікамі. І яна магла б быць канструктыўнай, калі б была раўнапраўнай, справядлівай, абапіралася б на міжнароднае заканадаўства. Краіны, народы і іх лідары зразумелі: калі так будзе працягвацца, іх не застанецца не проста на карце гісторыі, але нават у фізічным плане.

Адсюль пачаліся працэсы супрацьдзеяння. Адным з гэтых працэсаў з'яўляецца працэс рэгіяналізацыі. Эканамічная бяспека, ваенная бяспека, дэмаграфічны патэнцыял і яго захаванне — усё гэта магчыма захаваць, прымножыць і развіць толькі ў рамках рэгіянальных блокаў».



**Кацярына СЕРАФІНОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

«Эканоміка — стратэгічны кірунак жыццядзейнасці любой дзяржавы, а сёння для нашай краіны, як і для Расіі, ва ўмовах санкцыйнага ціску з боку шэрагу недружалюбных дзяржаў ён набывае асаблівае значэнне. Хоць трэба прызнаць, што ва ўсе гады сваёй дзейнасці на пасадзе Прэзідэнта Аляксандр Лукашэнка шмат увагі ўдзяляў развіццю рэальнага сектара эканомікі, асабліва яе прамысловага патэнцыялу, сельскагаспадарчай галіны, наладжванню экспартных сувязяў.

І час паказаў, наколькі дальнабачнай была такая палітыка: сёння Беларусь забяспечаная харчаваннем, захоўваецца высокі вытворчы патэнцыял прадпрыемстваў. Будаўніцтва беларускай АЭС і ўвод яе ў дзеянне дазваляюць гарантаваць энергетычную бяспеку краіны.

Многія нашы прадпрыемствы вядомыя ў свеце як вытворцы надзейнай, высокапрадукцыйнай тэхнікі, якасных прадуктаў харчавання. Сацыяльна арыентаваная палітыка беларускай дзяржавы — узор клопату аб сваіх грамадзянах для многіх дзяржаў.

З улікам няпростага міжнароднага парадку хочацца падкрэсліць: Беларусь у рамках Саюзнай дзяржавы прадоўжыць паступальны рух у сваім развіцці, і садзейнічаць гэтаму будзе выкананне рашэнняў, прынятых кіраўнікамі дзяржаў Беларусі і Расіі ў час мінулай сустрэчы».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

З нагоды

# «РАДЫ, ШТО ЖЫВУ Ў БЕЛАРУСІ»

## Герой Беларусі Васіль РАВЯКА адзначыў 75-гадовы юбілей

**Віншаванні з 75-годдзем прымаў Герой Беларусі, старшыня СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Васіль Равяка.**

«Сваё жыццё вы прысвяцілі рабоце ў гэтым калектыве, у гэтай гаспадарцы вы 48 гадоў, з невялікім перапынкам на работу ў апараце абкама партыі, Мастоўскага райкама партыі. Пасля зноў вярнуліся сюды і ўжо 28 гадоў нязменна кіруеце гаспадаркай. Самыя цёплыя словы віншавання прасіў перадаць кіраўнік дзяржавы вам за нястомную працу, за работу, якую вы зрабілі і працягваеце рабіць для краіны. Вы стварылі высокарэнтабельную, высокаэфектыўную вытворчасць і калектыў, дзе выраслі дзясяткі спецыялістаў, якія кіруюць цяпер іншымі гаспадаркамі. Ваш аграгарадок нязменна падтрымлівае традыцыі, закладзеныя яшчэ ў 1970-я гады, развівае сацыяльную сферу», — адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА**, паведаміла БелТА. Пасля ён зачытаў прывітальны адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.



Фота БелТА.

«Нарадзіўшыся ў сям'і работнікаў сельскай гаспадаркі, я з самага ранняга дзяцінства чуў слова «Прагрэс» і чуў прозвішча Равяка. Заўсёды гэта гучала ў вельмі станоўчым ключы: гэта тыя людзі, у якіх трэба вучыцца, на якіх трэба раўняцца, і гэта гаспадарка, з якой трэба браць прыклад, — **сказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК**. — Вы даказалі, што ў сельскай гаспадарцы можна працаваць эканамічна эфектыўна, зарабляць грошы, але пры гэтым не проста зарабляць, а ўкладаць гэтыя грошы ў людзей. І сапраўды, вы карыстаецеся заслужанай павагай сваіх работнікаў, гаспадарка па-ранейшаму з'яўляецца адным з флагманаў Гродзенскай вобласці».

Ад імя Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталлі Качанавай павіншаваў Васіля Равяку старшыня Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў, член Савета Рэспублікі Віктар Лісковіч.

У сваю чаргу, Васіль Равяка падзякаваў гасцям за віншаванні і звярнуў увагу на тое, што развіццё гаспадаркі — заслуга цэлага калектыву. «Я ўдзячны за палітыку нашай дзяржавы ў сферы аграпрамысловага комплексу, — сказаў кіраўнік гаспадаркі. — Я магу меркаваць, наколькі Беларусь пайшла далёка. Нашу краіну сёння не пазнаць, гэта проста казка. Я вельмі рады, што ўсё маё жыццё склалася ў гэтай краіне».

Гаворачы аб поспехах СВК, Васіль Равяка адзначыў: «Ёсць элементы ўдачы. Але ўсе 28 гадоў, за выключэннем некалькіх дзён, я заўсёды быў незадаволены вынікамі сваёй працы (у будоўлі, уборцы). Вядома, я ўсіх напружваў. Але гэта, думаю, зрабіла сваю справу».




## Агульны намалот збожжа сёння перавысіць мільён тон

**Аграрыі Беларусі намалацілі 406,7 тысячы тон азімага рапсу, паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Паводле даных на 25 ліпеня, збожжавых і зернебабовых культур (без кукурузы, грэчкі, проса) убрана 268,8 тысячы гектараў або 13,6 працэнта ад плана. Намалочана 950 тысяч тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 35,3 цэнтнера з гектара. Чакаецца, што агульны намалот сёння перавысіць знакавую мяжу ў мільён тон.

Азімага рапсу на зерне ўбрана 174,4 тысячы гектараў (52,4 працэнта да ўборачнай плошчы), сярэдняя ўраджайнасць — 23,3 цэнтнера з гектара. Лён выцераблены на 16,4 тысячы гектараў, што складае 37,5 працэнта ўборачнай плошчы. Саломы пасля ўборкі збожжавых і зернебабовых убрана на плошчы 167,5 тысячы гектараў — 62,3 працэнта.

Нарыхтавана 370,2 тысячы тон сена — 38,5 працэнта да плана, 8,3 мільёна тон сенажу — 60,9 працэнта (у тым ліку ў палімерную ўпакоўку — 281,6 тысячы тон), 384,1 тысячы тон збожжасенажу і 206 тысяч тон сіласу. Усяго назапашана 2,7 мільёна тон кармавых адзінак травяных кармоў.

**Пётр ДУНЬКО.**

Падрабязнасці

# Мінспорт вызначыў патрабаванні да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў

## На першым плане — якасць

Эксперты пастаянна адзначаюць актыўнае развіццё ўнутранага турызму. Беларусы ўсё больш актыўна цікавяцца роднай краінай. Не зніжаецца і градус цікавасці і з боку грамадзян іншых краін. Раней **дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ірына ВАРАНОВІЧ** паведамляла, што колькасць расійскіх турыстаў, якія сёлета са студзеня да мая наведалі Беларусь, узрасла амаль у два разы ў параўнанні з аналагічным паказчыкам мінулага года. «З Расійскай Федэрацыі за перыяд са студзеня да мая 2023 года тэмп росту наведванняў павялічыўся на 173 %, гэта дастаткова высокія лічбы. Мы бачым развіццё сувязяў у сферы турызму не толькі з Масквой і Санкт-Пецярбургам», — адзначыла Ірына Варановіч.

На мінулым тыдні ў штаб-кватэры Садружнасці Незалежных Дзяржаў адбылося пасяджэнне экспертнай групы па дапрацоўцы і ўзгадненні праекта Плана мерапрыемстваў на 2024—2026 гады па рэалізацыі Стратэгіі развіцця супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у галіне турызму. Эксперты дапрацавалі і ўзгаднілі праект плана. Было вырашана занесці яго ва ўстаноўленым парадку на разгляд Савета міністраў замежных спраў СНД.

Турыстычны бум чакаецца ў Беларусі ўжо зусім хутка. Краіна чакае гасцей II Гульняў краін СНД, якія пройдуць з 4 па 14 жніўня. Адна з задач гэтага спартыўнага форуму — раскрыццё турыстычнага патэнцыялу Беларусі, дэманстрацыя ёе каштоўнасцяў і славутасцяў гасцям. Спаборніцтвы будуць прымаць 11 гарадоў, і кожны з іх падрыхтаваў самыя цікавыя турыстычныя маршруты. Усё гэта накладвае дадатковую адказнасць на тых, хто і паказвае гасцям краіну ва ўсёй яе красе, — экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў.

Пастановай Міністэрства спорту і турызму ад 4 ліпеня устаноўлены прафесійныя і этычныя патрабаванні да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. Пра гэта паведамляецца на Нацыянальным інтэрнэт-партале. У прыватнасці, падчас правядзення экскурсій неабходная наяўнасць пры сабе бэйджа экскурсавода, гіда-перакладчыка і пераліку тэм экскурсій, па якіх пройдзена прафесійная атэстацыя. Дзейнасць экскурсавода, гіда-перакладчыка павінна ажыццяўляцца на аснове прынцыпаў законнасці, кампетэнтнасці, справядлівасці і добрасумленнасці.

У ліку патрабаванняў таксама: праява павагі да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці, культурных і духоўных традыцый Беларусі і захавання яе гісторыка-культурнай спадчыны. Згодна з пастановай экскурсаводы і гіды-перакладчыкі павінны фарміраваць уяўленне аб Беларусі як аб краіне, прывабнай для турыстаў, экскурсантаў. Пры правядзенні экскурсій не дапускаюцца суб'ектыўныя некарэктныя ацэнкі і выказванні аб Беларусі і іншых дзяржавах. Экскурсавод ці гід-перакладчык павінны прымаць меры па недапушчэнні з боку турыстаў, экскурсантаў або іншых асоб некарэктных, правакацыйных і іншых негатыўных выказванняў або дзеянняў.

Адно з галоўных патрабаванняў — валоданне аб'ёмам ведаў і прафесійных навыкаў, неабходных для правядзення экскурсій на тэрыторыі Беларусі, уключаючы веды па гісторыі, этнаграфіі, культуры, эканоміцы, прыродна-геаграфічных асаблівасцях, унутранай і знешняй палітыцы краіны, актуалізацыя атрыманых ведаў для работы над своечасовым абнаўленнем індывідуальных тэкстаў экскурсій. Экскурсавод і гід-перакладчык павінны сачыць за забеспячэннем беражлівых адносін турыстаў, экскурсантаў да навакольнага асяроддзя, прымаць меры па недапушчэнні прычынення імі шкоды турыстычным рэсурсам. Сярод патрабаванняў таксама: каардынацыя паводзін турыстаў, экскурсантаў пры надзвычайных сітуацыях або іншых непрадбачаных абставінах, паведамленне кіраўніку суб'екта турыстычнай дзейнасці або іншай арганізацыі, якая прыцягнула экскурсавода, гіда-перакладчыка для арганізацыі экскурсіі, іх адасобленых падраздзяленняў аб узнікненні такіх сітуацый або абставін, выклік пры неабходнасці прадстаўнікоў экстранных службаў.

Акрамя таго, прадстаўнікі дадзенай прафесіі павінны выконваць аўтарскія і іншыя сумежныя правы распрацоўшчыкаў экскурсій, не дапускаць прысваення выпікаў інтэлектуальнай уласнасці, прыводзіць цытаты распрацоўшчыкаў экскурсій і іншых аўтараў у адпаведнасці з заканадаўствам і ўказаннем іх аўтарства.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «МАРУ, КАБ ЛЮДЗЯМ ХАЦЕЛАСЯ ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ У ГАРАДОЦКІМ РАЁНЕ»

**ХХХ Дзень беларускага пісьменства пройдзе на Віцебшчыне — зямлі, з якой звязаны нашы асветнікі: Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі і Васіль Цяпінскі. Ганаровая місія прымаць юбілейны фестываль выпала Гарадку.**



Гэтае лета сапраўды выдалася гарачым для ўсіх мясцовых жыхароў. Горад прыхарошваецца. Мяняюцца фасады будынкаў, вядуцца рамонты ва ўстановах культуры і адукацыі, кладуцца бардзюры, паляпшаюцца дарогі і асвятленне, добраўпарадкоўваецца гарадскі парк — на яго тэрыторыі падчас свята будуць працаваць малая сцэна і розныя інтэрактыўныя пляцоўкі.

Для ўстаноў культуры і адукацыі падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства — час актыўнай патрыятычнай работы з падрастаючым пакаленнем. Мясцовыя дзеці і моладзь знаёмяцца з традыцыямі сваёй зямлі, вывучаюць легенды, шукаюць звесткі пра знакамітых землякоў, развучваюць народныя танцы, гатуюць стравы, якія згадваліся ў паэме «Тарас на Парнасе», і запазычаныя ў мясцовых гаспадынь. Сваімі адкрыццямі яны гатовыя дзяліцца з гасцямі горада. На фестывалі можна будзе ўбачыць зробленыя імі малюнкі, сувеніры, пазнаёміцца з даследчымі работамі. Наогул у раёне актыўна адраджаюцца рамёствы. Ажурнае ткацтва, саломапляценне, інсітнае мастацтва і спіральнае пляценне Гарадоччыны трапілі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. З гэтымі элементамі можна будзе пазнаёміцца на выстаўцы — прэзентацыі падчас Дня беларускага пісьменства, якую прадставяць майстры Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору. Яны ж цяпер вырабляюць і сувенірную прадукцыю.

Тутэйшая зямля багатая на таленты. Мясцовыя паэты прысвячаюць ёй вершы. Абвешчаны конкурс «Я іду па родным горадзе», калі жыхары Гарадоччыны знаходзяць і фатаграфуюць мясціны, апетыя пісьменнікамі. А яшчэ ў раёне ажыццяўляецца мабільны праект «Паэтычны маршрут», калі вясковыя чытачы, якім літаратуру дастаўляе бібліёбус, слухаюць вершы мясцовых паэтаў у выкананні саміх аўтараў. Распрацоўваюцца новыя турыстычныя маршруты. Адзін з іх, дарэчы, дазволіць больш даведацца не толькі пра Канстанціна Вераніцына, аўтара паэмы «Тарас на Парнасе», але і пра іншых вядомых ураджэнцаў гэтага краю...

Падрыхтоўка да буйнога свята для населенага пункта — час, калі не толькі мяняецца яго аблічча. Жыхары атрымалі выдатную магчымасць заявіць пра сябе, вызначыць, чым яны могуць уразіць і захапіць гасцей, навучыцца цаніць тое, што маюць.

Узначаліць раён у такі няпросты, але вельмі цікавы час — справа даволі адказная.

***— Калі вы пагадзжаліся стаць старшынёй Гарадоцкага раённага выканаўчага камітэта, ці ставілі перад сабой пэўныя планы, можа, нават мары, якім хацелі бачыць свой унёсак у развіццё раёна?*** — цікаўлюся ў Ірыны Паляковай.

— У любым выпадку гэта павінна быць работа на вынік. Я мару, каб людзям хацелася жыць і працаваць у Гарадоцкім раёне, прычым не толькі тым, хто тут нарадзіўся і вырас. Важна, каб сюды прыязджалі новыя людзі. Вы нават уявіць сабе не можаце, які гэта цудоўны раён! Колькі становіцца эмоцый ён можа падарыць усім, хто сюды прыязджае. Калі да мясцовых дзяўчат прыязджаюць іх кавалеры з іншых гарадоў, то пасля знаёмства з усёй наваколнай прыгажосцю прызнаюцца, што, калі б нарадзіліся ў такіх мясцінах, ніколі б адсюль не з'ехалі...

***— Адразу відаць, невыпадкова побач з Дошкай гонару, якая размяшчаецца каля выканкама, у вас з'явіліся фота маладых людзей...***

— Сёлета ў рамках падрыхтоўкі да Дня пісьменства нашы спецыялісты вырашылі яе абнавіць, зрабіць блок для моладзі. Не сакрэт, што з праблемай замацавання маладых спецыялістаў сутыкаюцца многія невялікія населеныя пункты. Мы над ёй працуем. У нас ёсць аграрныя класы. Вядзём работу па мэтавых кірунках, каб пасля вучобы маладыя людзі вярталіся да нас жыць і працаваць. Ёсць арэнднае жыллё. У раёне хапае работы, іншая справа, ці пагодзіцца моладзь займацца сельскай гаспадаркай. Я заўсёды кажу, што на зямлі працуюць асаблівыя людзі. Без любові да зямлі тут рабіць няма чаго. Грошы проста так не плацяць, а калі выконваць усе задачы, выкладвацца на максімум, дык і ў сельскай гаспадарцы можна зарабляць і дзве, і дзве з паловай тысячы рублёў. Вялікі плюс — недалёкая адлегласць ад Віцебска, менш чым за паўгадзіны на маршрутцы можна даехаць да абласнога цэнтра. У нас вельмі прыгожы горад. У 2014 годзе Гарадок прымаў абласныя «Дажынкі», тады ён моцна змяніўся. Развіваецца сацыяльная сфера. Робіцца вельмі многае для таго, каб жыхары маглі весці здаровы лад жыцця. Ёсць басейн, фітнес-зала, трэнажорная зала, валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі. Для людзей любога ўзросту, ад дзяцей да пенсіянераў, шмат прапаноў, чым заняцца ў вольны час. Гэта гурткі, секцыі, хор ветэранаў, разнастайныя мерапрыемствы. Сапраўды для працы і адпачынку ёсць добрыя ўмовы. Вельмі зручна, што ўсё побач. Хочацца пераключыцца — можна выйсці на «Вераб'ёвы горы», дзе створана адна з найлепшых у краіне лыжаролерных трас. Так, калі Федэрацыя біятлона праводзіла ў нас кубак, спартсмены былі ў захапленні ад трасы, рэльефу. Трэба ўлічваць і нашы прыродныя ўмовы — тут раней, чым у іншых раёнах, выпадае снег і больш часу ляжыць. Так, у канцы сакавіка ў нас яшчэ было багата снегу. Сюды прыязджаюць трэніравацца расіяне. У нас моцная дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, нашы дзеці на абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах заўсёды на п'едэстале. «Вераб'ёвы горы» нікога не пакінуць абыякавымі. Зімой, калі мы рыхтаваліся да абласной лыжні, памятаю, як увечары прыехала на трэніроўку. Еду на лыжах і пасля лаўлю сябе на думцы, што паўтары гадзіны не думаю, як карміць жывёлу, вырашаць разнастайныя задачы. Павольна падаюць сняжынкі, мяне ўжо клічуць ехаць дадому, а я прашу: «Дайце яшчэ пастаяць». Такое хараство, быццам нейкі цуд...

***— Што страчваюць турысты, якія не даязджаюць да Гарадка?***

— Што шукаюць людзі, калі з'язджаюць з вялікага горада? Цішыню, прыгажосць, уражанні. Тут усё гэта маецца. Цудоўная прырода. Напрыклад, у нас ёсць возера ў вёсцы Сурміно, у вадзе якога павышаная канцэнтрацыя іонаў серабра. Ёсць гарадзішчы і гістарычныя помнікі. Мноства легендаў. Мы спадзяемся, што Дзень беларускага пісьменства дазволіць у тым ліку прэзентаваць і наш турыстычны патэнцыял. Да свята рыхтуецца ўвесь раён. Чакаем, што прыедзе багата гасцей. Спатрэбяцца экскурсаводы, упор будзем рабіць на нашых настаўнікаў, краязнаўцаў.

***— Наколькі рашэнне, што менавіта Гарадок будзе прымаць юбілейны Дзень беларускага пісьменства, ужо змяніла гараджан? Ці можна казаць пра ўсплёск крэатыўнасці?***

— Сапраўды, гэта творчы працэс, у якім задзейнічана вялікая колькасць людзей. Мы вырашаем, чым максімальна напоўніць дні, калі будзе праходзіць свята, як уразіць гасцей, якія правесці мерапрыемствы і конкурсы. Ёсць некалькі цікавых задумак, якія хочацца пакуль пакінуць у сакрэце. Распрацоўваецца сувенірная прадукцыя. Клопатаў дадалося. Горад змяніцца. Амаль штодзённа ідуць работы то на адным аб'екце, то на іншым. Практычна ўсе прадпрыемствы і ўстановы ўключаны ў такую работу. Самы актыўны ўдзел бяруць грамадскія арганізацыі: Беларускі саюз жанчын, «Белая Русь», Федэрацыя прафсаюзаў, БРСМ і ў першых шэрагах — дэпутацкі корпус. Кожны кіраўнік на сваім месцы, акрамя тых планаў, якія мы даводзім, бачыць, што яшчэ хацелася б зрабіць. Працуем з прыватным сектарам, з жыхарамі горада, каб прывадзілі да ладу свае дамы і ўчасткі. Праводзяцца раённыя суботнікі. Людзі выходзяць папрацаваць, каб зрабіць лепшым месца, у якім жывуць. Задзейнічаны ўстановы адукацыі, нават бацькі вучняў.

***— Як спалучыць у адным мерапрыемстве дзве ідэі: Дзень пісьменства і Год міру і стваральнай працы?***

— Яны выдатна спалучаюцца. Наша пісьменства заўсёды было скіраванае на тое, каб ствараць, спазнаваць, аб'ядноўваць. І сёння творчасць дапамагае захоўваць усё тое, што маем: традыцыі, культуру, гісторыю. Мы бачым у творах сучасных аўтараў любоў да Радзімы, зварот да наступных пакаленняў, каб яны зберагалі і прымнożылі народныя здабыткі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Юліі РУДЗЯКОВАЙ.**

Запрашальнік

# «Вялікая бард-рыбалка» — галоўнае свята Чыгірынскага кластара

**Такую характарыстыку даў фестывалю, які адбудзецца ў гэтыя выхадныя, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.**

Фестываль «Вялікая бард-рыбалка» праводзіцца ў 12 раз і сёлета ў яго будуць свае асаблівасці. Пра гэта ішла гаворка падчас прэс-канферэнцыі на чале з намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерыем Малашкам. Анлайн удзел у ёй узялі намеснік старшыні Быхаўскага райвыканкама Віктар Агнетаў, раённыя масмедыя, а таксама прадстаўнікі кіраўніцтва Гомельскага аблвыканкама і СМІ Гомельшчыны.

Каб было да канца зразумела, Чыгірынскі кластар — гэта вялікі сацыяльна-турыстычна-эканамічны праект, што рэалізоўваецца ў Быхаўскім раёне. Ён аб'ядноўвае розныя суб'екты гаспадарання, якія вядуць сваю дзейнасць на Чыгірынскім вадасховішчы. І «Вялікая бард-рыбалка» якраз праходзіць у гэтых мясцінах. Для зручнасці наведвальнікаў месца яе правядзення стала больш даступным, летась яна перамясцілася на базу адпачынку Магілёўскага металургічнага завода ў Чачэвічах.

— Дадзены фестываль — цэнтральнае мерапрыемства Чыгірынскага кластара, — падкрэсліў намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка. — Дзясяткі суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці ўдзельнічаюць у вялікім праекце. І ў найбліжэйшы час мы звядзём усё гэта ў адзін вялікі механізм, які будзе функцыянаваць па розных кірунках.

Намеснік старшыні адзначыў таксама, што фармат і кантэкст мерапрыемства вонкава застануцца ранейшымі, але яно стане яшчэ больш дасканалым — з улікам тых заўваг і прапаноў, якія паступалі ад наведвальнікаў.

Намеснік старшыні аблвыканкама акцэнтаваў увагу на зручнасці новага размяшчэння, бо тут ёсць прывязка да ўсіх іншых пляцовак мерапрыемства, сюды можна дайсці нават пешшу ад трасы Бабруйск — Магілёў. Яно мае выдатнае тэхнічнае забеспячэнне, каб усе маглі бачыць і чуць, што будзе адбывацца на асноўнай сцэне.

Новая канцэптуальная старонка фестывалю — спроба спалучыць яго з сібірскім бард-праектам «Станцыя Сібір». Асаблівасць расійскага фэсту таксама ў памкненні захаваць цёплую сяброўскую атмасферу для тых, хто спявае і захапляецца аўтарскай песняй.

У фестывалі бярэ ўдзел больш чым 50 выканаўцаў аўтарскай песні, у тым ліку з-за мяжы. На яго едзе з Рыгі лідар латвійскага гурта Da'Ba, аматар бардаўскай песні Аляксандр Казакоў. Сярод вядомых удзельнікаў — стваральнік і куратар партала bards.ru Сяргей Мацвеенка, Раман Філіпаў.

«Вялікая бард-рыбалка» — гэта не толькі рыбалка і песні каля вогнішча. Гэта яшчэ і шмат іншых не менш цікавых складнікаў — конкурс па рыбнай лоўлі на прызы магілёўскай крамы «Рыбачок», конкурс «Каралева бард-рыбалкі», адкрыты турнір па пляжным валейболе на прызы кампаніі «Гродфуд»... Будзе чым захапіцца і дзецям. На свята прыедуць з канцэртам трыа «Фіеста» з Маладзечна, тэатр жывых лялек з Томска.

Мерапрыемства набірае папулярнасць сярод маладых сем'яў, якія прысутнічаюць на ім поўным саставам. Яно адбудзецца ўжо ў гэтую суботу, і забраніраваць месца сёння складана нават на найбліжэйшых аграсядзібах. Але ў Быхаўскім райвыканкаме супакоілі, што наогул будзе дзе прыпыніцца: падрыхтавана пляцоўка, дзе можа адначасова ўстанавіць да некалькіх сотняў палатак. Да 500 месцаў пашырана і аўтастаянка.

Начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама Алена Куканькова паабяцала, што госці свята застануцца задаволеныя беларускай кухняй. Гасцей будзе абслугоўваць 35 аб'ектаў гандлю, да паслуг наведвальнікаў створаць 400 пасадачных месцаў.

Тым, хто ўпершыню збіраецца на фестываль, трэба мець на ўвазе, што ўваход платны — 20 рублёў. Выключэнне складаюць дзеці да 7 гадоў і інваліды.

— Магілёўскі аблвыканкам паклапаціўся, каб кожныя выхадныя гэтай цудоўнай пары года праходзілі цікава і пазнавальна, — адзначыў Валерый Малашка. — Фестывальныя мерапрыемствы, якія ўжо адбыліся, сабралі шмат наведвальнікаў. Сведчанне таму — купальскі фестываль у Александрыі, на якім пабывала 75 тысяч чалавек. І калі Александрыя — гэта купальская лугавіна, то «Вялікая бард-рыбалка» — цудоўнае вадасховішча і лес. І тут таксама шмат цікавінак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# І нарадзілі, і пашану заслужылі

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

— Хацелася б усім даць вышэйшую адукацыю, — кажа жанчына.

Часткова яе мара збываецца. Старэйшы Віталь, якому споўнілася 23 гады, працуе інжынерам і вучыцца завочна ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Міхаілу 22 гады. Ён абраў для сябе высакародную і пачэсную прафесію пажарнага і паралельна набывае вышэйшую адукацыю. Прыкладам для хлопца стаў бацька, які працуе ў Лагойскім раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях. Валерый перайшоў у сёмы клас, Васіль — у другі. Самаму маленькаму Колю споўнілася паўтара года.

— Я вельмі хацела дзяўчынку. Але, як бачыце, на свет з'явіліся адны хлопцы, — усміхаецца гаспадыня.

— А не паспрабуеце нарадзіць дачушку? — цікаўлюся ў Алены Васілеўны.

— Ды позна ўжо. Мне 42 гады, мужу 50, — гучыць у адказ. — І так хапае клопатаў. Гэта ж не дзяўчынкі, якіх можна прытуліць, пагутарыць па шчырасці, вызнаць сакрэты. Хлопцы лічаць сябе сапраўднымі мужчынамі, не хочуць дзяліцца сваім патаемным, таму даводзіцца толькі здагадвацца, пра што яны думаюць.



Уладзімір, бацька сямейства, перадае працавітасць і любоў да тэхнікі дзецям.

Маці радуе, што старэйшыя сыны выраслі працавітымі. У сям'і вялікая гаспадарка: парсюкі, трусы, каровы, куры, гусі. Акрамя таго, вырошчваюць ячмень, пшаніцу, бульбу. Хутка пачнецца другі ўкос кармоў. Ім — асаблівая ўвага, жывёла павінна якасна харчавацца, каб даваць добры прыплод і надоі. Шмат клопатаў дадаюць вялікі агарод, цяпліцы, сад. Сям'я набыла тры трактары і неабходнае навяснае абсталяванне.

Вялікую дапамогу бацькам аказваюць і малодшыя сыны. Васіль наглядае за Колем, збірае траву для трусоў, пасе курант. Валерый корміць парсюкоў, прывязвае кароў на пашы.

Старэйшыя хлопцы часта наведваюць бацькоўскі дом. Яны гаспадарлівыя, адказныя. Віталь любіць тэхніку, сам рамантуе. Гэтае захапленне яму перадалося ад таты, які неаднаразова ўдзельнічаў у жніве, мае ўзнагароды за выдатную працу.

— У мяне надзейны тыл, без якога немагчыма было б весці хатнія і бытавыя справы, — прызнаецца Алена Васілеўна. — Толькі даенне кароў займае каля дзвюх гадзін. А тым часам нельга кінуць малога без нагляду. На выручку прыходзяць сыны, супакойваюць, гушкаюць, калі ён плача.

Гаспадыні даводзіцца круціцца з раніцы да вечара, каб усё паспець. Акрамя таго, яна вырабляе сыры, якія карыстаюцца попытам не толькі ў Гайне, але і ў навакольных вёсках, Лагойску.

Алена Дышлевіч нарадзілася і жыла ў Мінску. Але летнія канікулы праводзіла ў вёсцы ў дзядулі. Дзяўчынцы падабалася карміць жывёлу, назіраць за ёй. І жанчына не шкадуе, што пераехала ў сельскую мясцовасць. Менавіта ў Гайне яна сустрэла сваё каханне. З сяброўкамі пайшлі ў мясцовы клуб, куды прыехаў цырк. Там і пазнаёмілася з будучым мужам. На той час ёй было 17 гадоў. Вяселле зладзілі пасля паўналецця.

І вось ужо больш за 20 гадоў сужэнцы жывуць у згодзе, ганарацца сваімі дзецьмі, для якіх бацькі з'яўляюцца дастойным прыкладам для пераймання.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Аляксандра КЛІМАЎЦА.**



Бацькоўская хата, якую рэканструюе шматдзетная сям'я.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША рыхтуецца вынесці імпічмент Байдэну



Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША мае намер правесці расследаванне з мэтай далейшага вынясення імпічменту прэзідэнту краіны Джо Байдэну з-за ўцягнутасці яго сям'і ў карупцыйныя схемы за мяжой. Аб гэтым заявіў спікер Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША Кевін Макарці ў эфіры тэлеканала Fox News, паведаміла ТАСС. Увесну рэспубліканцы з камітэта па наглядзе і падсправаздачнасці Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША заявілі аб атрыманні імі доказаў таго, што члены сям'і Байдэна і злучаныя з імі асобы раней нібы атрымлівалі мільёны долараў з-за мяжы праз сетку кампаній. Па словах старшыні камітэта Джэймса Комера, сям'я Байдэна і звязаныя з ёй асобы выкарыстоўвалі даныя кампаніі для ўласнага ўзбагачэння і атрымалі ад гэтага больш за $10 млн.

### Парламент Ізраіля на фоне пратэстаў адобрыў першую частку судовай рэформы



Дэпутаты Кнэсета (парламента Ізраіля) большасцю галасоў адобрылі ў другім і трэцім чытаннях першы законапраект у рамках судовай рэформы, якая выклікала масавыя пратэсты ў краіне, паведаміла ТАСС. Удакладняецца, што на галасаванне быў вынесены праект закона аб адмене так званага прынцыпу разумнасці. Згаданы дакумент з'яўляецца часткай запланаванай урадам Ізраіля судовай рэформы. У адпаведнасці з ім будуць абмежаваныя паўнамоцтвы Вярхоўнага суда Ізраіля. Да гэтага часу вышэйшая судовая інстанцыя мела права блакіраваць любое рашэнне ўрада, якое было б палічана юрыдычна неабгрунтаваным, але цяпер рэформа абмяжуе такія паўнамоцтвы. Абмеркаванне законапраекта перад вырашальным галасаваннем праходзіла на фоне масавых пратэстаў каля сцен Кнэсета. Пасля яго прыняцця дзясяткі тысяч маніфестантаў выйшлі на вуліцы Тэль-Авіва на акцыі пратэстаў.

### Прэзідэнт Туніса: развітым краінам замест продажу зброі трэба прадухіляць голад у Афрыцы



Каіс Саід выступіў на міжнароднай канферэнцыі па праблеме міграцыі ў Рыме, паведаміла інфармацыйнае агенцтва Tunis Afrique Presse. «Цяперашні міграцыйны крызіс з'яўляецца лагічным вынікам папярэдніх міграцыйных патокаў ва ўмовах акупацыі і каланіялізму», — адзначыў кіраўнік Туніса, гаворачы аб праблеме незаконнага перамяшчэння людзей з краін Афрыкі ў Еўропу. Саід раскрытыкаваў «рашучасць развітых краін прадаваць зброю афрыканскім дзяржавам з мэтай абвастрэння напружанасці і распальвання канфліктаў». «Нельга дасягнуць бяспекі і стабільнасці без вывучэння рэальных прычын няроўнасці і праблем у сферы бяспекі», — адзначыў Саід. На яго думку, «нелегальная міграцыя з гадамі ператварылася ў сапраўдную чалавечую трагедыю».


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора **ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»** (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) проводит открытый аукцион по продаже:

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Косилка откосов каналов К-78М, 2014 г. в. | 119604 | 4 128,00 | 412,00 |
| 2 | Косилка роторная навесная Л-501Д, 2014 г. в. | 119623 | 1 248,00 | 124,00 |
| 3 | Трактор-бульдозер гусеничный ДТ-75 ДЕРС4, 2005 г. в., регистрационный знак 7855 ОА, заводской № 735538 | 4017 | 6 624,00 | 662,00 |
| 4 | Полуприцеп специальный платформа АПС 554424, 2012 г. в., регистрационный знак А 1608 В-5, рама № Y39554424C0023200, цвет синий | 48262 | 16 128,00 | 1 612,00 |
| 5 | Полуприцеп бортовой МАЗ-975800, 2008 г. в., регистрационный знак А 4770 А-5, рама № Y3M97580080011275, цвет синий | 200786 | 2 400,00 | 240,00 |
| 6 | Полуприцеп бортовой МАЗ-975800, 2009 г. в., регистрационный знак А 6767 А-5, рама № Y3M97580090011900, цвет зеленый | 8646 | 2 400,00 | 240,00 |
| 7 | Прицеп самосвал МАЗ-857100, 2007 г. в., регистрационный знак А 3637 А-5, рама № Y3M857100 70003403, цвет серый | 8649 | 4 320,00 | 432,00 |
| 8 | Косилка откосов каналов К-78М, 2013 г. в. | 119603 | 4 800,00 | 480,00 |
| 9 | Автомобиль автобус-вагон «ГАЗель» ГАЗ-32213, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 9720-5, кузов № 32210090414833, X9632213090638715, цвет темно-синий | 119453 | 2 400,00 | 240,00 |
| 10 | Плуг четырехкорпусный полунавесной ПЛП-4-35 | 113392 | 844,80 | 84,00 |
| 11 | Выпрямитель сварочный «ЭСВА» ВД-306С1 УЗ, 2007 г. в. | 200771 | 758,40 | 75,00 |
| 12 | Выпрямитель сварочный «ЭСВА» ВД-306С1 УЗ, 2007 г. в. | 200772 | 758,40 | 75,00 |
| 13 | Навесное оборудование для экскаватора цепного универсального ЭЦУ-150 (2008 г. в.) в составе: шина баровой цепи со звездочками, цепь баровая с зимним рабочим органом, цепь типа «аллигатор» | 200789 | 2 016,00 | 201,00 |
| 14 | Автомат правильно-отрезной «Долина» ПРА 498А с разматывателем, 2010 г. в. | 200802 | 8 928,00 | 892,00 |
| 15 | Машина контактной сварки «DALEX» SL 202, 2010 г. в., серийный № AAA/II-33964 | 200821 | 6 432,00 | 643,00 |
| 16 | Пресс однокривошипный К2324, 1972 г. в. | 200822 | 2 688,00 | 268,00 |
| 17 | Гусеничный трактор МТЗ «Беларус» 1502-01 с бульдозерным отвалом, 2011 г. в., заводской № 041 | 119496 | 17 088,00 | 1 708,00 |
| 18 | Косилка ротационная навесная АС-1 (КДН-210) | 119592 | 1 728,00 | 172,00 |
| 19 | Косилка ротационная навесная АС-1 (КДН-210) | 119485 | 2 880,00 | 288,00 |
| 20 | Автомобиль легковой седан RENAULT LATITUDE, 2011 г. в., регистрационный знак 8039 IK-5, кузов (VIN) № VF1ABL1ZBUC255471, цвет серебристый | 200852 | 16 224,00 | 1 622,00 |
| 21 | Автомобиль легковой вагон УАЗ-22069-04, 2006 г. в., регистрационный знак 2697 ВА-5, кузов (рама) № 22060060206497, XTT22069060461716, цвет темно-зеленый | 10145 | 1 632,00 | 163,00 |
| 22 | Автомобиль легковой джип ВАЗ-2123 «Chevrolet Niva», 2011 г. в., регистрационный знак 2936 II-5, кузов (VIN) № X9L212300B0346141, цвет серо-зеленый металлик | 10147 | 5 568,00 | 556,00 |

*Стоимость снижена на 20 %.*

Шаг аукциона: 5 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.05.2023, 01.07.2023.

Аукцион состоится **10.08.2023 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.08.2023** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11, телефон для осмотра 8 (044) 767-96-71 (Валентина Валерьяновна).**

УНП 600077220



**ООО «Индустрия Инноваций»** сообщает об изменении даты проведения публичных электронных торгов (аукционов), извещение о проведении которых опубликовано в выпуске № 110 (29990) от 10.06.2023 (стр. 15). Подробности на сайте https://iintorgi.by.

УНП 291442411

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# ФАКТАРЫ РЫЗЫКІ, ЯКІЯ ПАГРАЖАЮЦЬ СЭРЦУ, І ЛЕКІ АД ІХ

**Што такое фактары рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў, ведаюць, мусіць, усе. Да іх адносяцца гіпертанія, курэнне, нізкая фізічная актыўнасць, вялікае спажыванне солі, павышаны халестэрын, лішняя маса цела, цукровы дыябет 2-га тыпу. Усё гэта класічныя і агульнавядомыя фактары рызыкі атэрасклерозу і хвароб, з ім звязаных, — ішэмічнай хваробы сэрца, інфарктаў, інсультаў. Але як іх выявіць у сябе? І самае галоўнае — як паўплываць? Ці адносіцца да фактараў рызыкі высокі пульс і якой у норме мусіць быць частата сардэчных скарачэнняў? Як часта трэба рабіць ЭКГ? Якія інавацыйныя методыкі выяўлення сардэчна-сасудзістых хвароб даступныя сёння беларусам? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты РНПЦ «Кардыялогія».**

## Усе на дыспансерызацыю

У сістэме аховы здароўя цяпер памяняліся адносіны да дыспансерызацыі, нагадала **намеснік дырэктара па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі РНПЦ «Кардыялогія» Наталля ШЫБЕКА.** Калі раней яна заключалася ў назіранні за пацыентамі, якія ўжо маюць пэўныя хваробы, то цяпер ухіл робіцца на прафілактыку.

— Медыцынскаму назіранню падлягаюць не толькі людзі, якія маюць хваробы сістэмы кровазвароту, але і цалкам здаровыя. Прычым прапаганда здаровага ладу жыцця павінна пачынацца не з 30-40 гадоў, калі людзі ўжо хварэюць, а з дзяцінства, — адзначыла кардыёлаг.

Як вядома, здаровы лад жыцця абавязкова ўключае фізічную нагрузку. Яна можа быць лёгкай, умеранай і інтэнсіўнай. Апошняя падразумявае штодзённыя аэробныя нагрузкі — хадзьбу, язду на веласіпедзе. Разам з гэтым здаровыя людзі мусяць займацца рэгулярна.

Другі кампанент — рацыянальнае харчаванне. Гэта зніжэнне колькасці солі да 5 г у суткі, ужыванне фруктаў не менш за 200 г і столькі ж гародніны, зніжэнне і выключэнне з рацыёну салодкіх напояў, прыярытэт ва ўжыванні рыбы (не менш за 1-2 разы на тыдзень), абмежаванне колькасці мяса да 500 г на тыдзень. А таксама адмова ад курэння і залішняга сядзення.

Калі хваробы ўжо маюцца, прафілактыка мусіць быць крыху іншай. У такіх людзей, як правіла, павышаныя халестэрын, артэрыяльны ціск, узровень цукру. І тут іншыя мэты: падтрымліваць мэтавы ўзровень халестэрыну, глюкозы ў крыві, артэрыяльнага ціску.

Ёсць яшчэ адна група людзей: якія атрымалі ўскладненні — інфаркт ці інсульт. Яны мусяць праходзіць пастаяннае пажыццёвае лячэнне медыкаментамі.

## Ці варта ўжываць для прафілактыкі такія сродкі, як мілдранат?

— З пункту гледжання прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў гэта не тая група прэпаратаў, якія дазваляюць прафілактаваць развіццё сардэчна-сасудзістых ускладненняў, — кажа **намеснік дырэктара па міжнародным супрацоўніцтве і аналітычнай рабоце РНПЦ «Кардыялогія» Алена ГРЫГАРЭНКА.** — Не бывае цудаў. Прыём курсам якога-небудзь лекавага сродку, які адносіцца да метабалічных прэпаратаў (а менавіта да іх адносіцца мілдранат), не дазволіць чалавеку эфектыўна змагацца з фактарамі рызыкі, што прыводзяць да развіцця хваробы, са змененымі сардэчна-сасудзістай сістэмы, метабалічнымі парушэннямі, якія могуць прывесці да неспрыяльнага канца ці да прагрэсіравання паталогіі, каторая ўжо маецца.

Кардыёлаг нагадала, што згодна з даследаваннямі, сумарны ўплыў на развіццё вострага інфаркту міякарда такіх фактараў рызыкі, як высокія артэрыяльны ціск, халестэрын, узровень глюкозы ў крыві, павелічэнне акружнасці таліі, недастатковае ўжыванне гародніны і фруктаў, злоўжыванне алкаголем, курэнне, псіхаэмацыянальны стрэс, перавышае 90 %.

— Калі ўрач кажа чалавеку, што, курачы пяць цыгарэт у дзень, вы на 40 % павялічваеце імавернасць развіцця інфаркту міякарда, а курачы пачак цыгарэт у дзень, вы на 400 % (ці ў дзесяць разоў) павялічваеце рызыку развіцця інфаркту міякарда ў параўнанні з чалавекам, які не курыць, да гэтага неабходна прыслухоўвацца, — звяртае ўвагу Алена Грыгарэнка. — Гэтыя высновы зроблены на выніках доказнай медыцыны. Праводзіліся эпідэміялагічныя даследаванні, якія паказалі, што высокі ціск можна карэкціраваць з дапамогай гіпатэнзіўных лекавых сродкаў; высокі ўзровень этэрагенных ліпапратэінаў, магчыма, і трэба карэкціраваць з дапамогай лекавых сродкаў і дыетатэрапіі. Таксама варта пазбавіцца ад курэння, недастатковай рухальнай актыўнасці, лішняй вагі і нерацыянальнага харчавання.

Частка фактараў рызыкі прыводзіцца ў норму з дапамогай лекавых сродкаў. Але ў іх пераліку адсутнічаюць метабалічныя прэпараты. Яны займаюць дастаткова вузкую нішу ў сучаснай кардыялогіі. Гэта ўсяго толькі дадатковы метад лячэння на фоне прыёму базіснай тэрапіі.

## Якія фізічныя нагрузкі аказваюць неспрыяльны ўплыў?

Найперш гэта статычныя нагрузкі, такія як падняцце цяжараў, а менавіта заняткі ў трэнажорнай зале, звязаныя з падняццем гір, штангаў, сілавыя нагрузкі. Акрамя таго, што яны знішчальна ўплываюць на касцёва-мышачную сістэму, разбураючы храсткі і суставныя паверхні, яны яшчэ негатыўна ўплываюць на сардэчна-сасудзістую сістэму.

## Як спартыўныя дабаўкі адбіваюцца на рабоце сэрца?

Такіх даследаванняў не праводзілася. Пры гэтым нельга адмаўляць, што бялок нашаму арганізму патрэбны: з яго дапамогай утвараецца мышачная тканка, гармоны, але яго лішак таксама дрэнны, найперш з-за дадатковай нагрузкі на выдзяляльную сістэму, у прыватнасці, на ныркі. Таму злоўжываць спартыўным харчаваннем не рэкамендуецца.

## Калі рэзка павышаецца пульс, гэта дрэнна?

— Усё, што адбываецца рэзка, не можа быць спрыяльным, акрамя хіба што рэзкай адмовы ад курэння ці алкаголю, — кажа Алена Грыгарэнка. — У адносінах да фізічнай актыўнасці ўрачы акцэнтуюць увагу здаровых людзей на тое, што яна мусіць быць рэгулярнай і дазіраванай. Калі ў вас ёсць мэта дасягнення пэўных вынікаў, напрыклад, штодзённай хадзьбы на 5 км, то прыйсці да гэтага выніку варта не на працягу двух дзён, а за месяц, паступова павялічваючы нагрузку з кантролем самаадчування і частаты сардэчных скарачэнняў.

Для здаровых людзей самаадчуванне з'яўляецца галоўным фактарам, які дазваляе пашыраць ці скарачаць фізічную нагрузку. Калі ж гаворка ідзе пра пацыента, што мае ішэмічную хваробу сэрца, перанёс інфаркт міякарда, то рухальны рэжым і праграма рэабілітацыі распрацоўваюцца пад кантролем урача агульнай практыкі, кардыёлага ці рэабілітолага. І тут важны такі крытэрый, як максімальная частата сардэчных скарачэнняў. З аднаго боку, нагрузка не павінна быць мяккай, яна мусіць мець трэніравальны характар і прыносіць карысць. З іншага боку, яна не павінна прыводзіць да выразнага пачашчэння пульсу і значнага пад'ёму артэрыяльнага ціску.

— Праблема высокай частаты сардэчных скарачэнняў з'яўляецца шматграннай. Ёсць здаровыя людзі, якія маюць невысокую частату сардэчных скарачэнняў — у межах 60 удараў у хвіліну, і мы можам канстатаваць, што гэта людзі, у арганізме якіх мае перавагу парасімпатычны аддзел вегетатыўнай нервовай сістэмы. Гэта іх асаблівасць. Напалеон, напрыклад, усё жыццё пражыў з частатой сардэчных скарачэнняў 40-45 і пры гэтым мог актыўна функцыянаваць, — прыводзіць прыклад кардыёлаг. — Ёсць іншая катэгорыя асоб, у каго пераважае сімпатычны аддзел вегетатыўнай нервовай сістэмы. Гэта здаровыя людзі, якія жывуць з частатой сардэчных скарачэнняў у межах 80 удараў у хвіліну.

Любая фізічная нагрузка выклікае павелічэнне пульсу, і справа ў тым, да якога ўзроўню ён павялічваецца. Узрастанне пульсу на фоне фізічнай нагрузкі да 100-110 удараў у хвіліну з'яўляецца нормай для здаровага чалавека. А вось для хворага чалавека гэта можа быць пагрозлівым станам, які справакуе з'яўленне клінічнай сімптаматыкі. Таму пры лячэнні захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, як правіла, прызначаюць лекавыя сродкі, якія ўплываюць на частату сардэчных скарачэнняў. Для пацыентаў кардыялагічнага профілю мэтавым узроўнем з'яўляецца 60-70 удараў у хвіліну.

## З узростам хваробы сэрца непазбежныя?

— Вядома, з узростам рызыка развіцця хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы павялічваецца, але нельга сказаць, што гэтыя хваробы непазбежныя. Калі ў чалавека ёсць культура здаровага ладу жыцця, калі ён адказна ставіцца да свайго здароўя, то зусім не абавязкова, што ў пажылым узросце ў яго з'явяцца ішэмічная хвароба сэрца ці іншыя цэрэбраваскулярныя хваробы, — тлумачыць Наталля Шыбека. — Безумоўна, ёсць фактары рызыкі, такія як генетычная схільнасць, з якімі мы нічога не зробім. Але ўсё астатняе, што мы можам змяніць, прывядзе да таго, што рызыка развіцця хвароб сістэмы кровазвароту зніжаецца. Калі ўявіць, што ў нас атрымалася скарэкціраваць усе фактары рызыкі, якія пад сілу чалавеку, то мы знізілі б рызыку развіцця хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы больш чым на 80 %.

## Ці патрэбныя вітаміны і мікраэлементы для сэрца?

— Калі чалавек прытрымліваецца прынцыпаў рацыянальнага харчавання і ўжывае дастатковую колькасць сезоннай гародніны і фруктаў, ён не мае патрэбы ў дадатковых вітамінах для паляпшэння работы сэрца, — лічыць Алена Грыгарэнка. — Калі ў працэсе дыспансернага назірання былі выяўлены дэфіцыт мікраэлементаў, а кардыёлагаў найперш цікавяць такія мікраэлементы, як калій, магній, кальцый, тады індывідуальна ў залежнасці ад узроўню змяненняў рэкамендуецца прыём БАДаў ці лекавых сродкаў, якія маглі б нармалізаваць іх узровень, а таксама высвятляюцца прычыны такіх змяненняў.

Што датычыцца вітамінаў, асаблівую ўвагу варта аддаваць вітаміну D. Ён найбольш скампраметаваны ў адносінах не толькі да развіцця парушэнняў з боку касцявой і мышачнай сістэм, але і да ўплыву на развіццё хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы.

## Як часта рабіць ЭКГ?

— Падчас дыспансерызацыі выяўляюцца фактары рызыкі ў здаровых людзей. Калі чалавек іх не мае, то да пэўнага этапу ЭКГ выконваецца толькі па паказаннях — падчас медагляду, пры паступленні ў навучальныя ўстановы, прыёме на работу. Калі выяўлены фактары рызыкі ці захворванні, частата залежыць ад канкрэтнага дыягназу, — кажа Наталля Шыбека.

**«Для здаровых людзей самаадчуванне з'яўляецца галоўным фактарам, які дазваляе пашыраць ці скарачаць фізічную нагрузку».**

## Як павысіць ціск у хатніх умовах?

— Калі ёсць такая асаблівасць, як гіпатанія, калі лічбы ціску трымаюцца ў межах 100 на 60, каб павялічыць ціск, варта павялічыць аб'ём вадкасці, папросту падняць аб'ём крыві. Як тое зрабіць? Выпіць шклянку вадкасці. Яна павінна быць або салёная, або салодкая. Трэба легчы, прыпадняць ногі, выпіць шклянку салодкага чаю або шклянку вады і з'есці салёны агурок, — рэкамендуе Наталля Шыбека.



## Як зразумець, што ў вас праблемы з сэрцам?

— Адсутнасць сімптомаў не заўсёды з'яўляецца прыкметай дабрабыту. Таму створаны праграмы дыспансерызацыі, актыўнага выяўлення фактараў рызыкі, каб у агульнай папуляцыі вылучыць асоб з нізкай, сярэдняй, высокай, вельмі высокай і экстрэмальна высокай рызыкай, — кажа Алена Грыгарэнка. — У групу з вельмі высокай і экстрэмальна высокай рызыкай могуць трапіць тыя людзі, што не маюць ніякіх скаргаў і да пэўнага моманту выконваюць свае бытавыя і прафесійныя задачы. Таму важна ведаць, якія фактары рызыкі вядуць да хваробы, як іх прафілакціраваць і што карэкцыя фактараў рызыкі з'яўляецца сферай адказнасці не толькі аховы здароўя, але і самога чалавека.

Калі вы маеце высокі ціск, то можаце не адчуваць ніякіх змен, або адчуваць галаўны боль, галавакружэнне, пачашчанае сэрцабіцце, выразную стамляльнасць, зніжэнне памяці. Як выявіць павышаны ціск? Рэгулярна вымяраць яго танометрам.

Калі вы маеце недастатковую фізічную актыўнасць, то ўжо знаходзіцеся ў групе рызыкі па развіцці захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, не адчуваючы пры гэтым ніякага дыскамфорту. А вось факт з'яўлення скаргаў у кардыялогіі вельмі часта сведчыць пра стадыю захворвання, якая зайшла далёка.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

26 ліпеня 2023 г. № 26 (712)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


НАДЗЁННАЕ

# КОЖНЫ БУДЗЕ ПАЧУТЫ

**НА прыём да Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталлі Качанавай у Ганцавічах 19 ліпеня прыйшлі людзі з самымі рознымі пытаннямі. Каля 9 гадзін яна размаўляла з грамадзянамі, выслухоўвала іх праблемы, ставіла на кантроль пытанні, якія не ўдалося вырашыць на ўзроўні мясцовых органаў улады.**



## Шчырая размова

«Было шмат зваротаў, якія датычацца сістэмы аховы здароўя, аказання медыцынскай дапамогі. Цяпер актыўна працуе рабочая група. Вядома, для чалавека самае галоўнае — здароўе яго і родных, блізкіх. Людзі актыўна звяртаюцца з пытаннямі з нагоды замены тазасцегнавых суставаў. Прэзідэнт паставіў задачу да Новага года вырашыць дадзеную праблему. Радуе, што стала менш пытанняў па ЖКГ», — распавяла Старшыня Савета Рэспублікі.





Фота БелТА.

Але такія звароты усё ж былі. Так, напрыклад, жыхарку горада Баранавічы хвалюючь пытанні рамонту дома 1930 года пабудовы і кошту прыватызацыі жылля ў гэтым доме. Па словах гараджанкі, у яе доме, у адрозненне ад суседняга, ніколі не рабіўся капітальны рамонт, а ваду і газ давялося падводзіць самастойна.

— Юрыдычна я неадукаваная, але зубастая, — сказала баранавічанка. — Пачалавечы крыўдна. Мы ўсё за свой кошт рабілі, мой свёкар — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — падводзіў ваду, газ, а мы цяпер плацім па другім крузе.

Шчырая размова ішла лёгка, Наталля Качанава запэўніла, што з праблемай разбяруцца.

— Я вас прыму. Тэлефануйце адразу ў Савет Рэспублікі, гарбаты з вамі вып'ем.

Жанчына так расчулілася, што на развітанне сказала: «Люблю, цалую».

З 2016 года жыхарка Кобрына жыве без ацяплення. У доме былі дэманціраваныя ўсе камунікацыі. Аднавілі ўсё, акрамя ацяплення, а плату за яго патрабуюць. Наталля Іванаўна выслухала, даручыла разабрацца, узяла сітуацыю на кантроль.

Некалькі зваротаў датычылася працоўных адносін. Так, на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі прыехала мінчанка, якая не згодная з характарыстыкай, выдадзенай на папярэднім месцы работы. Былы наймальнік напісаў пра няўжыўчывы характар супрацоўніцы, цяпер у яе цяжкасці пры працаўладкаванні.

— Характарыстыка павінна быць аб'ектыўнай. Закранута рэпутацыя маладой жанчыны з добрай адукацыяй. Але, калі тут (у характарыстыцы) напісалі, што яна высокай кваліфікацыі, працаздольная, разумная, аднак пляце інтрыгі, я таксама б яе не ўзяла на работу. Але пад тым, што паказана ў характарыстыцы, трэба падпісвацца, таму што за гэтым — жыццё яе і дзіцяці. Ёй трэба жыць і працаваць, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна прапанавала заяўніцы садзейнічанне ў працаўладкаванні.

Жыхар горада Пінска прыбыў на прыём са скаргай на дзеянні службовых асоб у праваахоўнай сферы. Ён жадае, каб дапамаглі арганізаваць поўнае і аб'ектыўнае расследаванне. Да разгляду пытання пінчука падключыўся пракурор Брэсцкай вобласці Віктар Клімаў.

У складанай жыццёвай сітуацыі аказалася сям'я з Брэста. Грамадзянка Украіны і беларус выхоўваюць траіх дзяцей. Мужчына на аўтамабілі насмерць збіў супрацоўніцу мытні ў пункце пропуску «Казловічы», яго асудзілі на пяць гадоў калоніі. Жанчына папрасіла перагледзець пакаранне, якое лічыць строгім. На яе плечы лёг клопат пра дзяцей, значныя выплаты па крымінальнай справе. «Накіруем пракурору зварот. Пытанне ўзялі на кантроль. Чым зможам, пастараемся дапамагчы», — сказала Наталля Качанава.

Жыхарка Ганцавіч была сярод тых, чыё пытанне вырашылася хутка. Яе дачка скончыла Лідскі педагагічны каледж. Жанчына папрасіла пераразмеркаваць дзяўчыну па месцы жыхарства будучага мужа дачкі. Цяпер маладыя людзі будуць працаваць у Лідзе.

Жыхар вёскі Вялікія Круговічы Ганцавіцкага раёна Аляксандр прыйшоў па пытаннях дзяржаўных. Вясковец заклапочаны: тыя, хто ездзяць на заробкі і там зарабляюць немалыя грошы, — не плацяць падаткі.

— Наш раён нават адзін час лідзіраваў у вобласці па беспрацоўі. Наўскідку скажу, працэнтаў 20 насельніцтва працуе на выездзе. Гэта кажа пра тое, што яны падаткаў не плацяць. Я са сваёй заработнай платы плачу, хтосьці ж не плаціць, а сацыяльным пакетам карыстаецца, як і я. У прыватных гутарках людзі абураюцца. Трэба вырашаць пытанне, — лічыць Аляксандр.

Наталля Качанава падтрымала вяскоўца, сказала, што для выканання сацыяльных гарантый, а гэта дапамогі, пенсіі, ахова здароўя і іншае, трэба, каб усе плацілі падаткі:

— А што сёння трэба зрабіць, каб людзі разумелі, што трэба працаваць? Мы гаворым пра тых людзей, якія нябедна жывуць і не працуюць, — звярнулася яна да Аляксандра. Калі ў вас нешта з'явіцца цікавае, нейкія прапановы, то вы павінны нам сказаць. Вы падумайце, патэлефануйце нам тады ў Савет Рэспублікі.

## «Не нашых пытанняў няма»

Наталля Іванаўна звярнула ўвагу, што пры арганізацыі выязных прыёмаў грамадзян прыярытэт аддаецца зваротам людзей, якія жывуць у дадзеным горадзе, раёне, вобласці. «Выязджаючы на месцы, сустракаемся з людзьмі, бачым, як яны жывуць і працуюць, якія ў іх праблемы. Гэта дазваляе нам і службовым асобам, што займаюцца канкрэтнымі пытаннямі, больш аператыўна дапамагаць людзям у вырашэнні праблем», — адзначыла спікер.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Прымусовае лячэнне для папярэджання злачынства



**Экспертным саветам на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ разгледжаны шэраг пытанняў, у тым ліку праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні кодэксаў», унесены Саветам Міністраў.**

Праектам карэкціруюцца Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы. У мэтах аптымізацыі механізмаў крымінальна-прававой абароны непаўналетніх прапануецца ўстанавіць асобны парадак прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння да асоб, якія ўчынілі злачынствы супраць непаўналетніх і ў якіх выяўлена расстройства сексуальнай перавагі (педафілія).

Паводле інфармацыі галоўнага ўпраўлення наркагандлю і процідзеяння гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў, пытанне процідзеяння педафіліі актуальнае і патрабуе ўдасканалення не толькі аператыўна-прафілактычнай работы, але і нормаў дзеючага заканадаўства.

Цяпер з папраўчых установ падлягаюць вызваленню асобы, асуджаныя больш за дзесяць гадоў таму за гвалтоўныя злачынствы сексуальнага характару ў адносінах да дзяцей і абарот дзіцячай парнаграфіі. Дадзеная катэгорыя злачынцаў часткова мае дыягназ «расстройства сексуальнай перавагі (педафілія)» і складае пагрозу для беларускага грамадства. У сувязі з гэтым ужо сёння неабходнае прынясце ў адносінах да іх мер прымусовага лячэння і комплекснага прафілактычнага ўздзеяння.

Па ўсіх крымінальных справах, звязаных з сексуальным гвалтам у адносінах да непаўналетніх і абаротам дзіцячай парнаграфіі, прапануецца абавязковае прызначэнне судова-псіхіятрычных экспертыз у дачыненні да абвінавачанага.

Эксперты падкрэсліваюць, што педафілія — захворванне, але гэта не псіхічнае расстройства, якое робіць чалавека шалёным. Апошняе азначае, што вінаваты будзе прыцягнуты да адказнасці і яму будзе прызначана пакаранне. Пры гэтым паколькі хворы на педафілію не разглядаецца як чалавек менш цвярозага розуму, то якія-небудзь паслабленні, абмежаванні, прадугледжаныя ў заканадаўстве для ўстанаўлення мякчэйшай меры пакарання дзеля ўжывання мякчэйшага пакарання ў адносінах да гэтых асоб не дзейнічаюць.

«Мы павінны разумець у дачыненні да тых, у каго адбылася такая трагедыя, — гэта скалечаныя сем'і, скалечаныя лёсы. Таму тут трэба прымаць дзейсныя меры», — канстатавала Наталля Качанава.

Для стварэння ўмоў садзейнічання дасягненню мэт крымінальнай адказнасці экспертамі прапануецца распаўсюдзіць сферу ўплыву артыкула 107 Крымінальнага кодэкса ў частцы прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння ў тым ліку на асоб, якія маюць педафілію, што дасць магчымасць абавязаць апошніх да праходжання прымусовага лячэння. Гэта значыць, згоды вінаватага на яго лячэнне не патрабуецца.

## Усе пытанні дзелавой актыўнасці

**27 ліпеня прыёмы грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб правядуць два сенатары.**

Раніцай, з 10 да 13 гадзін, у Мінску па вуліцы Кірава, дом 47, усіх, хто накіраваў адпаведнае пісьмо ў Савет Рэспублікі (220016, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9), выслухае **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ.**

У другой палове дня, з 15 да 17 гадзін, **член гэтай жа парламенцкай камісіі, загадчыца натарыяльнай канторы горада Пінска Ірына САЧКОЎСКАЯ** прыме грамадзян, прадпрымальнікаў і іх прадстаўнікоў у Пінску па вуліцы Горкага, дом 15.

# КОЖНЫ БУДЗЕ ПАЧУТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Старшыня Савета Рэспублікі распавяла журналістам, што нядаўна наведала Віцебскую і Мінскую вобласці і яе ўвага была прыкаваная да жыцця людзей у аграгарадках і невялікіх вёсках, работы сельсаветаў. «Законы ў нашай краіне для ўсіх дзейнічаюць аднолькава, а вось вырашаюцца праблемы грамадзян па-рознаму. На мой погляд, гэта залежыць не толькі ад органаў улады, але і ў большай ступені ад кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў. Ёсць добрыя прыклады, за якія можна парадавацца: за работу ФАПаў, гандлёвых аб'ектаў, устаноў адукацыі. Ёсць і раёны, дзе існуюць праблемы на аналагічных аб'ектах», — расказала Наталля Качанава.

Прыём грамадзян у Ганцавічах адбыўся ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян у Брэсцкай вобласці. У іншых гарадах рэгіёна члены верхняй палаты парламента таксама выслухалі дзясяткі пытанняў, прапаноў і скаргаў ад жыхароў. Усяго было прынята 90 чалавек. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: скаргі людзей не могуць вяртацца да крыніцы праблемы. Маленькая вёска ці буйны горад — сёння кожны грамадзянін павінен быць упэўнены, што яго пачуюць і са сваім пытаннем ён не застанецца сам-насам.

Работа са зваротамі грамадзян у Беларусі выбудаваная на дастаткова высокім узроўні, падсумавала для журналістаў Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

— Такая работа выбудаваная на дастаткова высокім узроўні ў нашай краіне ў цэлым, бо дакладна вызначана законам, як павінны працаваць службовыя асобы, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый з насельніцтвам. Сістэма ў гэтай рабоце ёсць, тут няма ніякага сумневу. Іншая справа, мы разумеем, што жыццё кожны раз задае новыя пытанні і задачы, якія паўстаюць перад намі, — сказала Наталля Качанава.

На яе думку, у Брэсцкай вобласці дастаткова эфектыўна працуюць са зваротамі грамадзян.

— Яшчэ год таму былі скаргі ад людзей, што цяжка трапіць да нейкіх службовых асоб. Сёння ўжо з такім да нас не звярталіся. Пытанняў сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія традыцыйна займаюць вялікую долю ў агульным шэрагу зваротаў, было няшмат. Гэта сведчыць аб тым, што ў Брэсцкай вобласці змаглі выйсці на такі ўзровень, што колькасць адпаведных зваротаў да нас зменшылася, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

На наступны дзень, 20 ліпеня, на выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу ў Івацэвічах былі разгледжаны вынікі работы са зваротамі грамадзян у Брэсцкай вобласці за першае паўгоддзе. У пасяджэнні ўзялі ўдзел памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Вакульчык, старшыні гарадскіх, раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, члены Маладзёжнага савета.

Па колькасці зваротаў грамадзян да сенатараў Брэсцкая вобласць займае трэцяе месца сярод рэгіёнаў краіны. Удзельная вага зваротаў ад жыхароў вобласці склала каля 11 працэнтаў. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць зваротаў павялічылася на 6 працэнтаў і склала 3,6 тысячы, прычым кожны чацвёрты зварот да членаў Савета Рэспублікі — паўторны.

— Не нашых пытанняў няма, — падкрэсліла Наталля Качанава. — І яшчэ я хачу сказаць: мы павінны больш жорстка адсочваць усе пытанні, якія не вырашаюцца, і аператыўна звязвацца з мясцовымі органамі ўлады. Трэба рабіць так, каб была зваротная сувязь, таму што ў гэтую работу ўключаныя ўсе.

Прытым, што ў цэлым Брэсцкая вобласць дастаткова эфектыўна працуе са зваротамі грамадзян, ёсць пытанні да Баранавіч, адзначыла спікер.

— Я праводзіла прыём у Ганцавічах, але туды прыехала досыць шмат людзей з Баранавіч. Тут аб'ектыўна: пасля Брэста гэта самы буйны горад. Але гарвыканкам, мне бачыцца — там дзесьці ёсць фармальны падыход у разглядзе зваротаў грамадзян. Пераканаўчая просьба: трэба глыбока займацца пытаннямі, нават калі яны непрыемныя. Калі мы хочам, каб людзі нас разумелі, давяралі, і тыя задачы, якія стаяць перад намі, мы вырашалі больш эфектыўна, — акцэнтавала Наталля Качанава. — Чым больш вы будзеце працаваць з людзьмі, паказваць, тлумачыць, распавядаць, тым менш будзе пытанняў, таму што людзі ўжо інфармаваныя. Такія выязныя мерапрыемствы дазваляюць і нам, і вам лепш даведацца аб тым, што адбываецца на месцах, у рабоце выкарыстоўваць усё, што мы пачулі ад вас, для таго каб адстойваць тыя рашэнні, якія, як кажа наш Прэзідэнт, ідуць ад зямлі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА

# МАЗГАВЫ ЦЭНТР ДЛЯ ВЫПРАЦОЎКІ СІСТЭМНЫХ РАШЭННЯЎ

## Спікер верхняй палаты парламента абазначыла шэраг задач перад рэктарскім корпусам краіны

**ПАДЧАС удзелу ў пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сфармулявала ключавыя моманты ў фарміраванні маладзёжнай палітыкі краіны і ролі ў гэтым кіраўнікоў ВНУ.**



Фота БелТА.

### Удзел у заканатворчасці

Перш за ўсё, рэктарскі корпус павінен быць прадстаўлены ў Савеце Рэспублікі, лічыць Наталля Качанава: «Таму што рэктары — людзі дасведчаныя, падрыхтаваныя да работы з моладдзю».

Паводле слоў спікера, Рэспубліканскаму савету рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь сёння трэба не проста абмяркоўваць пытанні вышэйшай школы. «Вам трэба ўжо быць мазгавым цэнтрам, які б прапаноўваў сістэмныя рашэнні. Напрыклад, па маладзёжнай палітыцы», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

### «Без выхавання — нікуды»

Яшчэ адна задача ад кіраўніка парламента — рабіць усё, каб моладзь заставалася і працавала ў рэгіёнах.

«Гаворыць Прэзідэнт — заўсёды праламляйце на сябе: што вы яшчэ павінны зрабіць, за вамі ж моладзь, — сказала Наталля Качанава, звяртаючыся да рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі. — За вамі вялікія калектывы, і ваша адказнасць за іх — сур'ёзная. Вы павінны ўсе кансалідавацца, вашы калектывы павінны быць аднадумцамі ў вырашэнні тых задач, якія ВНУ даводзяцца. Вы не павінны адыходзіць ад выхавання ў сваіх установах адукацыі, без выхавання — нікуды. Вы для сябе паглядзіце, як будзе функцыянаваць ВНУ сёння, заўтра, паслязаўтра. Думайце аб перспектывах развіцця вашых ВНУ».

Трэба знаходзіць формы і метады работы з моладдзю, падкрэсліла спікер. «Запрашайце ў ВНУ службовых асоб, сустракайцеся самі з юнакамі і дзяўчатамі, праводзьце з моладдзю як мага больш сустрэч, — адзначыла старшыня Савета Рэспублікі. — Нашы дзяржаўныя сімвалы, тое, што характарызуе нас як народ, нацыю — усё гэта павінна быць у ВНУ. Трэба гаварыць з моладдзю аб малой радзіме, патрыятызме і рабіць усё, каб наша моладзь заставалася і працавала ў рэгіёнах. Думайце аб такіх мерапрыемствах, як «Цягнік Памяці».

«Як кажа кіраўнік дзяржавы: самы вялікі запыт у грамадстве — на справядлівасць. У вас таксама ўсё павінна быць па справядлівасці. Тым больш што вы працуеце з моладдзю, якая асабліва востра адчувае несправядлівасць», — дапоўніла Наталля Качанава.

### Экспарт ведаў

На пасяджэнні савета рэктараў увага была ўдзелена і навучанню замежных студэнтаў у беларускіх ВНУ. «Дзеці з іншых краін хочуць вучыцца ў нашых ВНУ, беларуская адукацыя прэстыжная», — расказала Старшыня Савета Рэспублікі журналістам па выніках пасяджэння.

«Кожная ВНУ сёння працуе і з замежнымі студэнтамі. Мы, заканадаўцы, дастаткова часта сустракаемся з пасламі, якія працуюць у нашай краіне, выязджаем у замежныя камандзіроўкі. І многія гавораць аб тым, што юнакі і дзяўчаты з іншых краін хочуць вучыцца ў нашых ВНУ, беларуская адукацыя сёння прэстыжная. Таму трэба вырашаць пытанні лагістычна — як гэта забяспечыць».

Наталля Качанава паведаміла таксама, што на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў абмяркавалі і іншыя пытанні, якія неабходна вырашаць аператыўна.

«Для нас яшчэ вельмі важная як для заканадаўцаў адпрацоўка тых пытанняў, якія рэгламентаваны Кодэксам аб адукацыі і іншымі законамі, што дзейнічаюць у нашай краіне. І вось такая зваротная сувязь вельмі важная», — падсумавала яна.

**Паводле БелТА.**

НА КАНТРОЛІ

# СТАВІМ АМБІЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка аддае вялікую ўвагу развіццю дрэваапрацоўчай галіны нашай краіны. У 2012 годзе ён жорстка раскрытыкаваў тэмпы мадэрнізацыі вытворчасці ў дадзенай сферы. Тады дэталёвая размова адбылася ў ААТ «Івацэвічдрэў». Праз чатыры гады кіраўнік дзяржавы даў даручэнне арганізаваць на гэтым прадпрыемстве вытворчасць мэблі. Праз год даручэнне было выканана. На мінулым тыдні падчас рабочага візіту ў Брэсцкую вобласць Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава азнаёмілася з тым, як ідуць справы на «Івацэвічдрэў» цяпер.**



Сёння «Івацэвічдрэў» — адно з найбуйнейшых беларускіх дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, якое спецыялізуецца на вытворчасці драўняна-стружкавых пліт і мэблі. У калектыве больш за 850 супрацоўнікаў. На «Івацэвічдрэў» арганізаваны поўны цыкл вытворчасці: ад лесанарыхтовак, транспарціроўкі, першаснай апрацоўкі сыравіны, дрэваапрацоўкі да выпуску гатовых вырабаў. Кампанія клапоціцца аб навакольным асяроддзі, беражліва ставіцца да прыродных рэсурсаў, імкнецца да вытворчасці экалагічна чыстых вырабаў і прапануе прадукцыю, створаную ў адпаведнасці са строгімі еўрапейскімі нормамі бяспекі і якасці. «Івацэвічдрэў» ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з патрабаваннямі FSC, пацвярджае легальнасць закупак драўніны і выключае верагоднасць перапрацоўкі незаконна нарыхтаванай драўніны. Летась прадпрыемства было ўзнагароджана дыпломам «Найлепшы экспарцёр 2022 года» ў намінацыі «Дрэваапрацоўчая і мэблевая вытворчасць».

**Генеральны дырэктар ААТ «Івацэвічдрэў» Аляксандр ІЛЬНІЦКІ** распавёў дэлегацыі на чале з Наталляй Качанавай аб рабоце цэха па вытворчасці драўняна-стружкавых пліт, цэнтральнай аператарскай цэха ДСП, лабараторыі па выпрабаванні драўняна-пліткавых матэрыялаў, канвеера па вытворчасці ДСП, участкаў шліфавання, ламінавання, насычэння дэкаратыўнай паперы і ўчастка пагрузкі гатовай прадукцыі. Адно з даручэнняў Прэзідэнта — асвоіць выпуск уласнай мэблі — выканана.

— У рамках выканання даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое было дадзена нам у 2016 годзе, арганізавана вытворчасць мэблі. Літаральна праз адзін год і цяпер удзельная вага продажаў мэблі ў агульным аб'ёме нашых продажаў дасягнула 20 працэнтаў. Нашай мэтай з'яўляецца развіццё прадуктаў высокай перапрацоўкі, дзе маржа з аднаго кубічнага метра перапрацаваных намі пліт у чатыры разы вышэйшая, чым з саміх пліт пры рэалізацыі іх на свабодны рынак. Летась мы павялічылі аб'ём вытворчасці мэблі амаль у два разы, сёлета ў нас такі ж план. Гэта значыць, мы ставім перад сабой досыць амбіцыйныя задачы.

Акрамя мэблі, у ліку асноўных відаў дзейнасці ААТ — вытворчасць драўняна-стружкавых і ламінаваных пліт. За першае паўгоддзе іх выпушчана 123,2 тысячы кубічных метраў — крыху менш, чым за ўвесь 2022 год. Сума інвестыцый у асноўны капітал перавысіла тры мільёны беларускіх рублёў: для павелічэння вытворчых магутнасцяў па выпуску ламінаваных пліт у ААТ рэалізоўваецца інвестыцыйны праект, які прадугледжвае пашырэнне дзеючай вытворчасці ДСП. Рэалізацыя праекта разлічана на 2022—2024 гады.

Прадпрыемства ажыццяўляе інвестыцыйны праект па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці ламінаваных пліт ДСП. Гэта дазволіць стварыць як мінімум 28 новых працоўных месцаў, пашырыць асартымент і стаць больш канкурэнтаздольным на рынку. Прадукт вельмі запатрабаваны сярод вытворцаў мэблі як унутры краіны, так і за яе межамі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

# ВЁСКА Ў СПАДЧЫНУ

## У Берштах Шчучынскага раёна вельмі сардэчна ставяцца да бацькоўскіх сядзіб

**ЧАС ад часу мне даводзіцца наведвацца ў гэтую вёску па сямейных абставінах. Таму добра памятаю, як мянялася яе аблічча. Быў перыяд, калі тут вiравала жыццё, працавала школа на 200 вучняў, была бальніца, даволі багаты калгас. Потым неяк усё заціхла, не стала калгаса, закрылі школу і бальніцу, народ падаўся ў гарады, на вуліцах і падворках стала пуста. Назіраць за гэтым было балюча. Але апошнім часам сітуацыя змянілася. Бершты нібы займелі другое жыццё. У чым справа? Аказалася, многія вяртаюцца ў бацькоўскія дамы, даглядаюць іх, добраўпарадкоўваюць. Месцічы з радасцю прымаюць і тых, хто купляе безгаспадарныя сядзібы альбо будуе новы дом.**



Стараста вёскі Аляксандр ВАСІЛЕВІЧ.

### «Шкада, што сталых людзей мала»

Стараста вёскі Аляксандр Васілевіч ветліва сустракае карэспандэнта «Звязды». Прызнаецца, што здароўе вось пачало падводзіць, але пагаджаецца правесці да суседзяў. Як і большасць жыхароў, Аляксандр Аляксандравіч родам з гэтых мясцін, шмат гадоў працаваў настаўнікам музыкі ў школе, удзельнік ансамбля «Бершты». Кажа, што і сёння клуб не пустуе, і святы, і канцэрты ладзяцца. Асабліва цёпла праводзяцца віншавальныя сустрэчы старэйшых юбіляраў, ім рыхтуецца спецыяльная праграма. Такой увагай ахоплены жыхары не толькі Берштаў, але і навакольных вёсак.

Праўда, прадстаўнікоў старэйшага пакалення не так шмат. Мясцовая жыхарка Наталля Павайба назвала такую сітуацыю адным з мінусаў сваёй вёскі.

— Не хапае старых — так хочацца, каб па вёсцы хадзілі бабулі і дзядулі, але іх амаль няма, няма такога, як раней, калі з кійком нехта ідзе. Цяпер да пажылых ходзяць сацыяльныя работнікі, таму яны практычна не выходзяць на вуліцу. А раней у краму прыйдзеш, так цікава іх паслухаць, — з ноткай горычы кажа жанчына.

Наталля з мужам пераехалі сюды гадоў 30 таму, абодва таксама тутэйшыя. Пабудавалі дом. На падворку — плантацыя буякоў, свая пасека, хатнія птушкі. Работы хапае, кажа гаспадыня, але ў параўнанні з тым, як жылі бацькі, цяпер жыццё выдатнае. І бульбы столькі садзіць не трэба, і буракі ў калгасе палоць...

### «Грошы разыдуцца, а хаты не будзе»

Разам са старастам ідзём да яго суседзяў якраз цераз дарогу. Тут раней жыла аднакласніца Аляксандра Васілевіча з дзецьмі. Потым дачка Тацццяна забрала маці ў горад. Паўстала пытанне, што рабіць з домам.

— Спачатку хацелі прадаваць, — расказвае Тацццяна. — Я зайшла да мамы ў пакой, яна ў той час хварэла. Завялі гаворку пра дом. Яна кажа: рабіце, дзеці, што хочаце. Але ўсё ж чакала, што я вырашу. Мне сваякі параілі: Таня, не прадавай хату, грошы разыдуцца, а хаты ў цябе не будзе. Я прыйшла да маці і кажу: мы хату прадаваць не будзем, пакіну яе сабе. Яна сказала: гэта правільнае рашэнне, і хоць мама ўжо не хадзіла, але мне здалося, што яна ўстане і пойдзе, столькі ў яе было радасці.

Сёння, гледзячы на гэты дагледжаны дом, і не скажаш, што хата старая. А будавалі яе яшчэ продкі Тацццяны. Нашчадкі перарабілі печ, зрабілі рамонт. Сродкаў на аднаўленне трэба нямала, але гаспадары іх знаходзяць.

— Нашы мясціны багатыя на лясныя дары, з гэтага можна мець дадатковы даход, многія так жывуць. Таксама заробкі ўкладваем у падняцце сядзібы, — паясняе Тацццяна.

Яна заўважае, што з працоўнымі месцамі тут складана. У асноўным месцічы працуюць у лясніцтве, ёсць магчымасць ездзіць у сезон на збор буякоў і клубніц у суседні калгас. Сельгаспрадпрыемства забяспечвае транспартам.

Недахоп працоўных месцаў хоць і звужае магчымасці Берштаў, але не фатальны для вёскі. Выгляд населенага пункта сведчыць аб тым, што ён жыве. Многія хаты, кажа Тацццяна, дасталіся ў спадчыну дзецям, і яны даглядаюць іх. Нават тыя, што далёка жывуць, напрыклад, у Мінску ці нават у Маскве, прыязджаюць кожны год на цэлае лета. Пустых дамоў амаль няма.

### «Ніколі не стаяла пытанне прадаць бацькоўскі дом»

У летнія дні на вуліцах Берштаў даволі ажыўлена. Многія сем'і з дзецьмі ідуць на мясцовае возера, якое, дарэчы, здаўна славіцца сваёй рыбалкай і папулярнае ў турыстаў. Мясцовыя прадпрымальнікі нават выкупілі за адну базавую велічыню былую школу і бальніцу для арганізацыі тут базы адпачынку. Але будынкі, відаць па ўсім, патрабуюць значных фінансавых укладанняў, таму справа пакуль ідзе марудна.

Затое месцічы стараюцца прывесці свае дамы ў парадак. І хоць Бершты знаходзяцца ў баку ад магістраляў, многія сем'і прыязджаюць сюды кожныя выхадныя, а некаторыя жывуць і па паўгода, садзяць агарод, робяць рамонт, нарыхтоўваюць дровы.

Ала і Іван Навіцкія — якраз з ліку апошніх. Яны жывуць у Гродне, але шмат часу праводзяць у бацькоўскім доме.

— У нас ніколі не стаяла пытанне прадаваць бацькоўскі дом, — кажа Ала. — Бацькі як пажаніліся, гэты дом пабудавалі, цяпер мы яго даглядаем, прыязджаюць дзеці з унукамі. наогул дамы тут нядрэнна цэняцца. Насупраць нас гаспадыню сталую забралі ў інтэрнат, а хату прадалі амаль за восем тысяч долараў. Шмат новых людзей прыехала сюды, атрымалі ўчасткі, будуюцца. Гродзенцы купляюць і жыхары Шчучына, нашага райцэнтра.




Ураджэнка Берштаў Лілія Дарашкевіч расказала, што ў іх з мужам у вёсцы дзве бацькоўскія хаты, таму адну прадалі ў добрыя рукі, а другую цяпер аднаўляюць для сябе.

— Мы прыязджаем вельмі часта, хоць яшчэ працуем у Гродне на заводзе. У выхадныя заўсёды тут, нават зімой. Абнавілі амаль увесь дом, гаспадарчыя пабудовы, засталося толькі веранду адрамантаваць. Ёсць летняя кухня і лазня. Былі аварыйныя дрэвы, мы іх прыбралі, пасадзілі туі, кветкі. Каб пастаянна тут жыць, трэба зрабіць некаторыя даробкі, бо патрэбны камфорт, — расказвае жанчына.

Разам з тым яна паспявае і ў лес у грыбы-ягады схадзіць. Каторы раз упэўнілася, што тут жывуць сапраўдныя аматары гэтай справы, а, значыць, людзі дбайныя, якія імкнуцца зарабіць і ўкласці сродкі ў свае сядзібы.

— Наша вёска — гэта найбольш месца для летняга адпачынку. Тутэйшых не так шмат, затое ў сезон амаль усе вокны свецяцца. Вельмі шмат дзяцей. І дамы тут нядрэнна купляюць, але вёска магла б быць больш ажыўленая, калі б дарога была лепшая. Ёсць участкі па 3-4 кіламетры, якія нагадваюць пранік. Таму некаторыя адмаўляюцца купляць тут дамы. Трэба вельмі любіць гэтую вёску, каб сюды ездзіць, — рэзюміруе суразмоўніца.

### Бярозавы край

Менавіта такое паходжанне назвы вёскі, якая ўпершыню згадваецца ў XV стагоддзі. Гэта даволі знакаміты населены пункт, тут праходзіў сейм ВКЛ, ладзіліся каралеўскія паляванні. У гушчарах Берштаўскай пушчы падчас вайны дзейнічалі партызанскія атрады.

Любоў Русілка, былая дырэктарка школы, можа доўга расказваць пра малую радзіму. Кажа, што вельмі любіць гэтыя мясціны.

— Я вельмі рада, што тут жыву, мне некалькі разоў прапаноўвалі застацца ў Гродне, там працаваць у інстытуце развіцця адукацыі, але я не пагадзілася і ніколі не шкадавала аб тым. Не хачу з тутэйшых мясцін з'язджаць. І цяпер бачу, як тут аднаўляюць дамы, гэта мяне вельмі радуе. Раней на быт не так звярталі ўвагу, можа, таму, што гаспадаркі былі вялікія, шмат працавалі ў калгасе. Цяпер гэтага амаль няма. Затое ўвага аддаецца камфорту, — выказвае сваё меркаванне Любоў Мікалаеўна.

Летам у сталай жанчыны — поўны дом сямейнікаў. Тры гады назад яна з сынам Сяргеем вярнулася сюды з Гродна пасля пандэміі. Сын працуе кіроўцам і разам з сям'ёй займаецца перабудовай дома. Сёння тут ёсць і санвузел, і гарачая вада, у планах — павялічыць кухню. У сезон у доме збіраецца больш за дзесяць чалавек дзяцей і ўнукаў. Часта прыязджае дачка Вольга Русілка, вядомая ў Берштах асоба, дацэнт кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава. І яна, і Любоў Мікалаеўна — вядомыя паэткі.

Здаецца, што Бершты — не толькі бярозавы, але і надзвычай паэтычны край. Адзін з вершаў, які напісала мясцовая жыхарка Марыя Саковіч вельмі дакладна адлюстроўвае настрой сённяшніх яго жыхароў. У вершаваных радках — пажаданне нашчадкам захоўваць сядзібы бацькоў і дзядоў, а значыць, не даць згінуць вёсцы. А прачытаў мне гэты верш на развітанне стараста Аляксандр Васілевіч: *«Не прадавайце дом бацькоў, я заклінаю ўсіх сыноў, хай будуць цяжкасці любыя, вас не ўратуюць грошы тыя. / Яны дабра не прыдадуць, ніколі не дадуць спакою, агнём вам рукі апякуць, нібы праказаю якою. / Не прадавайце родны дом, бо ён не крама пры дарозе, бацькоў успомніце дабром, іх след не сцёрся на парозе...»*

### «Вяскоўцы шкадуюць, калі зносяць дамы»

Сапраўды, у Берштах не так шмат пустых дамоў, пагаджаецца старшыня Астрынскага сельвыканкама Наталля Лебядзевіч. Хоць большасць выкарыстоўваецца ў асноўным як дачы, дамы дагледжаныя і адрамантаваныя. Вядома, не абыходзіцца без зносу, але гэта крайняя мера. Напрыклад, па Сельскім Савеце, які налічвае больш за 70 вёсак, у год зносілі да 20 дамоў. Гэта нямала, лічыць старшыня сельвыканкама. Але з прыняццем Указа № 116 аб продажы безгаспадарных дамоў за адну базавую велічыню, сітуацыя змянілася. Цяпер мясцовыя ўлады бачаць сваю задачу ў тым, каб захаваць такія дамы. На сённяшні дзень з 20 пустых дамоў палова будзе мець новых гаспадароў. Продаж адбудзецца як за адну базавую велічыню пры адным заяўніку, так і праз аўкцыён, калі два і больш прэтэндэнтаў.

— Дзякуючы Указу мы можам прадаць дом за адну базавую велічыню, што дае магчымасць захаваць дом, а для мясцовых жыхароў гэта вельмі важна — яны шкадуюць такія дамы, — кажа Наталля Іванаўна. — Калі мы прыязджаем зносіць, яны вельмі перажываюць. Іншы раз нават зарослы дом для іх дарагі як памяць аб тых, хто там жыў.

У тым, каб захаваць дамы, і для дзяржавы ёсць пэўная выгада, лічыць старшыня сельвыканкама. І хоць іх продаж мала што дае мясцоваму бюджэту, але і страт такіх, як пры зносе дома, няма.

— Сёння даволі нявыгадна зносіць дом, асабліва калі там ёсць гаспадарчыя пабудовы, калодзеж, падвал, гараж і іншае, а падворак зарос хмызняком. Каб яго расчысціць, патрэбны значныя сродкі. Напрыклад, надоечы мы падалі заяўку на тэндар па закупцы падрадных паслуг па зносе сямі дамоў на суму 10,5 тысячы рублёў, гэта 1,5 тысячы за дом. І пакуль не аб'явіўся ніводны падрадчык на электроннай пляцоўцы. Арганізацыі лічаць, што гэта вельмі танна — ачысціць і прывесці ў парадак як мінімум 20 «сотак». А калі дом прадаецца нават за базавую велічыню, сродкі на знос эканомяцца, — акцэнтуе ўвагу Наталля Іванаўна.

Такім чынам, пры наяўнасці гаспадара эканомяцца бюджэтныя сродкі. Па-другое, кажа суразмоўніца, дагледжаныя дамы дазваляюць захаваць структуру вёскі, а не рабіць з яе хутар. Участак акультурваецца, чалавек афармляе дом і праводзіць там рэканструкцыю альбо вядзе новае будаўніцтва.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ЖЫВІ З АГЕНЬЧЫКАМ

# ІНІЦЫЯТЫЎНЫ АГРАГАРАДОК

**НА мінулым тыдні дэпутаты Мсціслаўшчыны сумесна з грамадскай арганізацыяй «Белая Русь» прэзентавалі ў Ходасах дзіцячую пляцоўку.**

Яна з'явілася на вуліцы Тэльмана, дзе першыя жыхары атрымалі жыллё яшчэ сорак гадоў таму. Сёлета старая гульнявая пляцоўка была цалкам адрэстаўравана. На адкрыцці прысутнічалі задаволеныя вынікамі сумеснай работы жыхары, прадстаўнікі мясцовай улады і шмат дзяцей.

— Вы ўсе аб'ядналіся для добрай справы, і яна матэрыялізавалася, — звярнулася да насельніцтва з прамовай ідэйная натхняльніца сацыяльных праектаў, старшыня райсавета дэпутатаў і раённай арганізацыі «Белая Русь» Алена Кляянкова. — У вольны ад работы час людзі прыходзілі і працавалі над тым, каб адмантаваць ужо існуючую пляцоўку і сабраць абсталяванне для новай. У Год міру і стваральнай працы гэтая пляцоўка набывае высокі аб'яднальны сэнс. Сумесная праца, накіраваная на стварэнне, заўсёды прыносіць добры вынік.

Для пабудовы дзіцячай пляцоўкі была створана ініцыятыўная група на чале са старшынёй Ходасаўскага сельвыканкама Анатолем Пруднікавым і заключаны дагавор на пастаўку абсталявання на суму 6,9 тысячы рублёў. Гэта прызавыя грошы за перамогу ў абласным конкурсе сярод сельскіх выканаўчых камітэтаў. Сваімі сіламі жыхары сабралі яшчэ дзве тысячы беларускіх рублёў.



Цікавай атрымалася забаўляльная праграма для дзяцей. Разам з аніматарамі яны спявалі, танцавалі, гулялі ў розныя гульні, удзельнічалі ў конкурсах. Ад грамадскай арганізацыі «Белая Русь» Алена Кляянкова падарыла хлопчыкам і дзяўчынкам салодкія падарункі.

А ходасаўцы ўжо думаюць, як зрабіць свой населены пункт яшчэ больш прыгожым і ўтульным. У аграгарадку пражывае 1,8 тысячы чалавек, сярод іх шмат актыўных. Сумесна з дэпутатамі і мясцовай уладай прагрэсіўная частка тутэйшага грамадства ажыццяўляе свае самыя смелыя ініцыятывы. Летась іх было дзесяць. Залажылі, напрыклад, Алею Славы, устанавілі памятны знак першаму дырэктару Ходасаўскай школы Сяргею Іванавічу Ксянзову — кіраўніку партызанскага атрада ў гады Вялікай Айчыннай вайны і адкрылі музей у школе, добраўпарадкавалі магілу Героя Савецкага Саюза генерал-маёра танкавых войскаў Піліпа Рудкіна, з дапамогай мясцовых індывідуальных прадпрымальнікаў у парку «Дружба» сумеснымі намаганнямі ўстанавілі летні амфітэатр... Сёлета таксама ўжо рэалізавана нямала цікавых праектаў. У цэнтры аграгарадка на воінскім пахаванні да 9 Мая быў запалены Вечны агонь. З гэтага дня па святах і кожную пятніцу каля яго нясуць вахту мясцовыя школьнікі. Працягваюцца работы і на месцы пахавання Героя Савецкага Саюза Піліпа Рудкіна. Ужо заказана мармуровая пліта для помніка і атрыманы ўсе дазволы на рэалізацыю ініцыятывы. Урачыстая цырымонія адкрыцця адбудзецца восенню.



— Асаблівасць ходасаўскіх ініцыятыў у тым, што ўсе яны распрацоўваюцца з улікам развіцця, нічога тут не робіцца проста дзеля «птушачкі», — адзначыла старшыня райсавета. — Насельніцтва зацікаўленае ў тым, каб іх праекты функцыянавалі, прыносілі карысць жыхарам і выхоўвалі ў моладзі любоў да малой радзімы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Мсціслаўскага райсавета дэпутатаў.**

ФІЗКУЛЬТ-УРА!

# РАМАНТЫКА ДЭПУТАЦКАЙ СПАРТАКІЯДЫ

**ЛЕТНЯЯ спартакіяда — 2023 запомніцца народным абраннікам Магілёўшчыны не толькі спаборніцтвамі і творчымі конкурсамі, але і рамантычным пражываннем у палатках у адной з маляўнічых мясцін Слаўгарада на беразе Проні. Гэтакі дэпутацкі міні-гарадок, які ўмясціў у сябе больш чым 200 чалавек — 24 каманды з усіх раёнаў Магілёўскай вобласці.**



На спартыўныя дасягненні народных абраннікаў натхнілі кіраўнікі — Магілёўскага абласвета дэпутатаў Ірына Раінчык, Слаўгарадскага райвыканкама — Андрэй Кажамякін, праўлення Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў — Анатоль Мацюлін і Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў — Святлана Язерская.

Так супала, што спартакіяда стартавала ў той дзень, калі ў Слаўгарадзе адзначалі любімы ў раёне гастранамічны фестываль «Гаспадарчы сыр». Таму перад тым як прыступіць да сяброўскіх паядынкаў, дэпутаты наведалі свята і на свае вочы ўбачылі, наколькі папулярныя дамашнія сыры. Па карысныя прадукт выстройваліся вялікія чэргі, у тым ліку з мінчан і жыхароў іншых далёкіх гарадоў. Дарэчы, урачыстае права адкрыць гастранамічны фестываль далі старшыні Магілёўскага абласвета дэпутатаў Ірыне Раінчык. Яна павіншавала прысутных ад імя Магілёўскага аблвыканкама і абласвета і адзначыла, што вялікая колькасць моладзі на свяце — добры знак. Значыць, народная спадчына і традыцыі ў надзейных руках.

Упершыню ў гісторыі існавання спартакіяды адбыліся спаборніцтвы па рыбнай лоўлі. І хоць дзеля гэтага ўдзельнікам прыйшлося прачнуцца а шостай гадзіне раніцы, ніхто не пашкадаваў. Нездарма ж выпускнікі слаўгарадскіх школ сустракаюць на Проні свае апошнія школьныя світанкі.

Відовішча, калі першыя промені сонца пачынаюць зіхацець у кропельках расы на палявых кветках і гушкацца на хвалях ракі, захапляе. Вялікага ўлову, на жаль, не атрымалася, але ўдзельнікі паставілі свае рэкорды. Першае месца за самую буйную рыбу вагой 130 грамаў атрымаў прадстаўнік каманды Магілёўскага раёна Андрэй Савонькін. Самай удачлівай рыбачкай, якая вылавіла найбольшую колькасць рыбы, стала прадстаўніца Кіраўскага раёна Таццяна Астроўская. А абсалютную перамогу ў конкурсе прынёс сваёй камандзе з Асіповіч яе прадстаўнік Аляксей Бяссонаў. Агульная вага яго рыбнага ўлову склала 455 грамаў.

Наогул спаборніцтвы, як заўсёды, праходзілі эмацыянальна і азартна. Па выніках усіх паядынкаў перамагла каманда Клічаўскага раёна. Дэпутаты Магілёўскага гарсавета занялі другое агульнакамандное месца, уступіўшы пераможцам усяго адзін бал. Трэцяе месца ў каманды з Касцюковіцкага раёна.



Былі таксама падведзены вынікі конкурсу мастацкай самадзейнасці, прысвечанага Году міру і стваральнай працы. Яго пераможцам стала каманда Чавускага раёна.

— Гэтая спартакіяда стала яшчэ адной яркай падзеяй у дэпутацкім жыцці, — адзначыла старшыня абласвета дэпутатаў Ірына Раінчык. — У нашай краіне шмат увагі аддаецца спорту, і народныя абраннікі сваім прыкладам паказваюць, наколькі гэта важна і карысна. Такія сустрэчы асабліва каштоўныя сваімі сяброўскімі сувязямі, зносінамі ў нефармальнай абстаноўцы, шчырасцю і разуменнем, як важна жыць у гармоніі з навакольным светам і любоўю да сваёй зямлі, народа, Радзімы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з сайта slavgorod.by.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.865. Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2023 года.

ИНКАСС ЭКСПЕРТ

Закрытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация
**«ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»**

220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, 13-й этаж
тел. +375 (17) 359 74 88
inbox.nkfo@incass-expert.by, www.incass-expert.by

**Финансовая отчетность о деятельности банковского холдинга, в состав которого входит закрытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ», опубликована на веб-сайте www.sber-bank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 июля 2023 года

*в тыс. бел. руб.*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2023 | 01.01.2023 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 88 070 | 79 104 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 008 | 16 865 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 1 404 | 484 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 | 1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6 106 | 5 873 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5 536 | 6 009 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 107 125 | 108 336 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 85 710 | 87 201 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 500 | 574 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 887 | 3 073 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 89 097 | 90 848 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3 711 | 3 711 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 821 | 678 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 6 | 6 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 13 490 | 13 093 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 18 028 | 17 488 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 107 125 | 108 336 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за шесть месяцев, закончившихся 30 июня 2023 года

*в тыс. бел. руб.*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2023 | 01.07.2022 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 14 | 343 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 248 | 415 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | (234) | (72) |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 957 | 4 560 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 866 | 1 001 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 091 | 3 559 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 32 | (140) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3 | 2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 19 036 | 18 283 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 20 728 | 19 236 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 102 | 182 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 092 | 2 210 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 552 | 832 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 540 | 1 378 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | |

Председатель Правления Э.Г. Гонтарь

Главный бухгалтер Е.М. Грибанова

Дата подписания: 05.07.2023 г.

УНП 807000255

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 28 августа 2023 года открытого аукциона по продаже имущества на праве хозяйственного ведения в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи с НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль легковой специальный универсал Renault Kangoo,** регистрационный знак 3905 ВЕ-3 с инв. № 504270002, VIN VF1KC0JCF38780521, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Речицкий, 9а. Автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Коробка передач требует замены, автомобиль подвергался среднему ремонту 5 раз, имеются незначительные очаги коррозии, в салоне сиденья продавлены, пружины сломаны, обшивка порвана. Пробег 310 632 км. | **4263,83** | 426,38 |
| 2 | **Автомобиль грузовой специальный фургон изотермический MAZ 4371 АФИК,** регистрационный знак АЕ 6057-3 с инв. № 504340001, VIN Y39437100F0007199, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Ленинская, 34. Автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Требуется капитальный ремонт двигателя, коробка передач требует ремонта, тормозные диски и колодки изношены, коррозия на кабине, дверях и капоте, имеется прогиб внутренней обшивки крыши, коррозия днища. Пробег 560 631 км | **12 829,57** | 1282,96 |

**Продавец:** Гомельский филиал РУП «Белпочта», 246048, г. Гомель-48, ул. Советская, 8. **Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (0232) 29-38-97, Щеглов Сергей Николаевич. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса». **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 июля 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 24 августа 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. Победитель аукциона либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на **5** % (далее – Претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу – затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего возмещение Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона), оплатить стоимость приобретенного имущества в течение **5 (пяти) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи, за исключением оплаты стоимости приобретенного имущества в рассрочку. Рассрочка оплаты стоимости приобретенного имущества предоставляется по письменному заявлению Победителя аукциона (Претендента на покупку) в соответствии с законодательством. Имущество, проданное с рассрочкой оплаты, находится в залоге у Продавца для обеспечения исполненной Покупателем обязанности по оплате его цены в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Передача имущества Покупателю будет осуществляться после полной оплаты цены продажи объекта. Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 «Об утверждении Положения о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности». **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-56, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

### Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

**Продавец:** ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», ул. Даумана, 95, 222120, г. Борисов, Минская обл., +375 177 78-83-92

**Оператор ЭТП**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by

| Предмет электронного аукциона | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|
| **Лот № 1 – имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 91, 91/1, 91/2, 91/3** | |
| **Венгерский склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 610/С-61387, общей площадью 1712,6 кв. м. Составные части и принадлежности: проезды (а1), подпорная стена (а2), ограждение (а3) | **585 000,00 белорусских рублей** |
| **Складское помещение РСЦ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 610/С-61388, общей площадью 71,5 кв. м | |
| **Склад и растворный узел РСЦ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 610/С-61389, общей площадью 198,8 кв. м | |
| **Материальный склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 610/С-61390, общей площадью 521,5 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка | |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 620850100014000861**: предоставлен на праве аренды по 20.04.2045 г. общей площадью 0,6550 га для обслуживания материального склада, складского помещения РСЦ, венгерского склада, склада и растворного узла РСЦ

**Условие аукциона:** Покупатель предмета аукциона обязан в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня покупки предмета аукциона или в иной, письменно согласованный с Продавцом срок, своими силами и за свой счет установить по границе земельного участка, разделяющей территории Продавца и Покупателя, ограждение территории (высота 3 метра, непрозрачное, с установкой на ограждении колючей проволоки Егоза)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **3** рабочих дня после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,8 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов. Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, так же **оплачивает затраты продавца** на проведение оценки в сумме 960,00 бел. руб.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.08.2023 г.** с 10.00 по 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 25.08.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. Email: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## Информация о проведении открытого аукциона 24 августа 2023 г. на право заключения договоров аренды земельных участков

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Срок аренды | Начальная цена земельного участка (бел. руб) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Смолевичский район, Усяжский с/с, в районе аг. Курково | 624885600003000382 | 0,4878 | для строительства и обслуживания производственно-складских зданий (1 11 02 земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности) | 99 лет | 5792,63 |
| 2 | Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода | 624883604601000535 | 0,4000 | для строительства и обслуживания многофункционального комплекса (1 16 22 земельный участок для размещения объектов многофункционального назначения) | 99 лет | 57 330,0 |
| 3 | Смолевичский район, Заболотский с/с, дер. Орешники | 624882004601000373 | 0,1875 | для строительства и обслуживания автостоянки и гаража-бокса для хранения автомашин специального назначения (1 16 05 земельный участок для размещения автостоянок и (или) гаражей) | 99 лет | 7335,94 |
| 4 | г. Смолевичи, ул. Станислава Монюшко, 16 | 624850100008000749 | 1,4800 | для строительства и обслуживания многофункционального торгового комплекса (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 99 лет | 208 569 |

Аукцион состоится 24 августа 2023 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

Круглы стол

# ЛЮСТЭРКА РАЗВІЦЦЯ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

**У Нацыянальным інстытуце адукацыі адбыўся круглы стол «Беларускі гістарычны часопіс: 30 гадоў у айчыннай навуцы і сістэме адукацыі». У ім узялі ўдзел навукоўцы, метадысты, настаўнікі, якія прыехалі з розных рэгіёнаў краіны. Падчас сустрэчы яны абмеркавалі кірункі развіцця гістарычнай адукацыі і яе адлюстраванне на старонках навукова-метадычных выданняў па гісторыі.**

— «Беларускі гістарычны часопіс» быў і застаецца для спецыялістаў-гісторыкаў прэстыжнай пляцоўкай для апублікавання як навуковых даследаванняў, так і метадычных распрацовак, адзначыла **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК.**

Яна заўважыла, што часопіс можна назваць люстэркам беларускай гістарычнай навукі, бо тут друкуецца інфармацыя пра найважнейшыя адкрыцці і дасягненні беларускіх гісторыкаў, паведамляецца аб знаходках археолагаў, на яго старонках сярод першых была надрукаваная канцэпцыя гістарычнай адукацыі.

Падчас сустрэчы ўдзельнікі абмяркоўвалі змены, якія адбываюцца ў сістэме гістарычнай адукацыі, а таксама пытанні, што датычацца методыкі выкладання прадметаў «Гісторыя Беларусі» і «Сусветная гісторыя».

**Галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса» Аляксандр КОРЗЮК** расказаў пра ролю навукова-метадычных выданняў у павышэнні прафесійнай кампетэнцыі настаўніка. Часопіс уваходзіць у Пералік навуковых выданняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, дзе могуць друкавацца дысертацыйныя даследаванні па гістарычных, юрыдычных навуках, мастацтвазнаўству і культуралогіі. «Такі высокі статус накладае на нас дастаткова высокія абавязкі па адборы кантэнту і па рабоце з аўтарамі, — заўважыў Аляксандр Корзюк. — На старонках часопіса адлюстроўваюцца апошнія дасягненні айчыннай гістарычнай навукі. Дзякуючы традыцыйным і новым рубрыкам мы можам ахапіць цэлы спектр гістарычных, эканамічных, гісторыка-культурных, прававых аспектаў дзейнасці і жыцця беларускай дзяржавы, беларускага грамадства. Часопіс адлюстроўвае беларускі погляд на сусветную гісторыю».

Па даручэнні Міністэрства адукацыі выданне забяспечвае навукова-метадычнае суправаджэнне выкладання ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі новага прадмета «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Стратэгічныя задачы, якія ставяцца перад сучаснымі педагогамі, адсвятляюцца ў рубрыцы «Адукацыйныя тэхналогіі XXI стагоддзя». З улікам попыту чытачоў часопіс распачаў дзве серыі — «Гісторыя і гісторыкі Беларусі» і «Музеі Беларусі». Вокладка выдання робіцца такім чынам, каб педагогі маглі яе выкарыстаць падчас заняткаў. Напрыклад, калі ў часопісе пададзена фота гістарычнага аб'екта, у ім можна знайсці пра яго інфармацыю.

Выданне актыўна супрацоўнічае з настаўнікамі школ і выкладчыкамі ўстаноў вышэйшай адукацыі. Гэта своеасаблівы штаб па арганізацыі мерапрыемстваў для студэнцкай і вучнёўскай моладзі. На яго старонках настаўнікі могуць дзяліцца з калегамі сваімі метадычнымі напрацоўкамі. Выданне карыснае як для маладых педагогаў, так і для тых, хто ўжо шмат гадоў выкладае гісторыю. Тут можна знайсці распрацоўкі ўрокаў па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, алімпіядныя заданні, інфармацыю, якая спатрэбіцца для правядзення інтэлектуальных мерапрыемстваў, даследчай дзейнасці, тэксты па краязнаўстве, музейнай педагогіцы.




Праблему пераводу навуковых ведаў у адукацыйныя падчас круглага стала ўзняў **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Сяргей ПАНОЎ.** Ён адзначыў, што сёння неабходна знайсці адказы на вельмі складаныя і сур'ёзныя пытанні: як падаць школьнікам канцэпты, якіх раней не было, распавесці пра беларускую дзяржаўнасць, сфарміраваць каштоўнасныя арыенціры, вызначыць пантэон нацыянальных герояў? Сам час падкідвае новыя выклікі. Так, сучаснае пакаленне ўспрымае інфармацыю па-іншаму — яму неабходна падаваць «малюнкі». Але якой павінна быць візуалізацыя ў гістарычнай навуцы? Хто ведае, як выглядалі Рагнеда, Рагвалод, Ізяслаў, Уладзімір? Ці можна выкарыстоўваць на ўроках і ў падручніках, напрыклад, выявы гэтых і іншых дзеячаў, створаныя мастакамі?..

«Гісторыя — цікавы, унікальны прадмет, калі вывучаецца тое, што немагчыманазіраць. Паміж падзеяй і яе даследчыкамі, у ролі якіх выступаюць вучні, — вялікая адлегласць», — заўважыла **старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі гісторыка-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Галіна ДАВІДОЎСКАЯ,** якая разгледзела такі трэнд сучаснай школьнай адукацыі, як фарміраванне ў вучняў вобразаў гістарычнага мінулага.

Ужо каля сямі гадоў **старшы выкладчык кафедры педагогікі і прадметных методык Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Аксана КОЛТАН** вывучае нацыянальную ідэнтычнасць як найважнейшы складнік школьнай гістарычнай адукацыі. Сёння мала распавядаць пра гістарычныя падзеі, не абысціся без іх інтэрпрэтацыі з улікам сучасных поглядаў, каб тым самым актыўна фарміраваць у вучняў нацыянальную ідэнтычнасць.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Антычнасць, ляпніна, фрэскі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з іншымі гасцямі шукаю Алебастравую залу, аб якой вяліся размовы задоўга да яе адкрыцця. Яшчэ тады самі рэстаўратары заявілі: маўляў, такога вы яшчэ не бачылі. Праўда, для таго каб знайсці гэтую незвычайную залу, прыйшлося падняцца праз лабірынты замка хіба што на пяты паверх.

Масіўныя дзверы адчыненыя — і адразу трапляеш у эпоху Рэнесансу з антычнымі сюжэтамі. Але пра гэта пазней, бо хочацца ў першую чаргу разгледзець вялікі камін. Ён займае цэнтральнае месца ў каралеўскім пакоі і ўяўляе з сябе збудаванне са складанай шматфігурнай кампазіцыяй з элементамі геральдыкі. Зразумела, што ўсё гэта павінна адлюстраваць статус уладальніка замка. Чым вышэйшы статус, тым пышнейшы камін.



— У нас ён амаль у рост сцяны, — расказвае **загадчыца мастацкага аддзела Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Алена РУСАЧАК.** — Камін зроблены з пясчаніку, не каляровы, майстры прынялі рашэнне не фарбаваць яго. У адпаведнасці з камінам выступаюць і столь з багатым рэльефным дэкорам, размешчаныя па вуглах залы карыятыды, а таксама бюсты вядомых персанажаў антычнасці.

А цяпер звернем увагу на роспіс столі і верхняга яруса сцен. Здаецца, што тут сабраны ўвесь антычны пантэон. Вось бог вінаробаў Дыяніс адорвае віном пастухоў, побач Кронас — бог часу з пясочным гадзіннікам, непадалёку пасланец багоў, ахоўнік гандляроў Меркурый з крылатымі сандалямі і посахам, які абвіваюць тры змяі. Яны глядзяць адна на адну — гэта сімвал згоды. Бог Янус з дзвюма галовамі — старой і маладой — увасабляе пачатак і канец усяго зямнога. Вядома, тут і сам Зеўс са сваёй грознай зброяй — маланкай, Няптун з трызубцам, яго брат, Аід з Цэрберам... І гэта толькі невялікая частка ўсяго грэка-рымскага пантэона. Пры жаданні можна знайсці яшчэ некалькі дзясяткаў знакамітых персанажаў антычнасці.



Алена Русачак раскрывае сэнс алегарычнай фігуры дабрадзейнасці над камінам. Аказваецца, гэты вобраз павінен адкрыць чалавеку праўду, таму гэта фігура трымае ў руках люстэрка з такім сэнсам: маўляў, люстэрка не хлусіць.

У антычныя кампазіцыі ўпісаны выявы горада Гродна. Гэтыя фрэскі сабраны на аснове дзвюх крыніц — гравюры Цюндта 1568 года і Макоўскага 1600 года. Зборныя фрагменты дазваляюць бачыць, як выглядаў горад падчас праўлення Стэфана Баторыя. Некаторыя будынкі дайшлі да нашых часоў, а некаторыя, на жаль, страчаныя.

— Жывапісныя работы і ляпніну выканалі беларускія мастакі «Белрэстаўрацыі». Назва залы ўказвае на наяўнасць дэкору з алебастру. Алебастрам з даантычных часоў называлі два розныя мінералы — дробназярністы кальцыт і гіпс. Вырабы з гэтых мінералаў у інтэр'ерах эпохі Рэнесансу сведчылі аб багацці і раскошы. Акрамя таго, назва «алебастр» таксама належала матэрыялу, сыравінай для якога служыць гіпсавы камень, здробнены ў парашок. Старажытныя грэкі і рымляне валодалі гэтай тэхналогіяй і актыўна прымянялі яе пры стварэнні скульптур і барэльефаў, — паясніла мастацтвазнавец.

Алебастравая зала — не прыдумка рэстаўратараў. Зала, як і іншыя, сапраўды існавала пад такой назвай. Найбольш ранні ўспамін аб Алебастравай зале Старога замка сустракаецца ў інвентары 1650 года, дзе ўказваецца яе знаходжанне — сярэдняя вежа. Зала знаходзілася на верхнім паверсе вежы, мела высокія столі і вялікія вокны. Ёсць меркаванні, што памяшканне служыла месцам адпачынку караля, куды ён ішоў, напрыклад, пасля лазні альбо праводзіў тут час у вузкім коле набліжаных асоб.

Звяртае на сябе ўвагу масіўная мэбля, якая зроблена на ўзор рэнесансных прыкладаў. Набор мэблі, дарэчы, мінімальны. Інтэр'ер дапаўняюць падлогавыя падсвечнікі і вельмі шыкоўная люстра. Яе зрабілі на бярозаўскім шклозаводзе, а каркас — на лідскай фірме.

— Адпачынак тут, хутчэй, сузіральны, гэтаму якраз і садзейнічае камін і роспісы, сюжэты якіх маюць павучальны сэнс, — адзначае Алена Русачак. — Праўда, Баторый не так доўга пажыў у сваёй гродзенскай рэзідэнцыі, нават не паспеў поўнасцю завяршыць перабудову замка пад палац. Сучасныя майстры прадставяць старажытны аб'ект прыблізна ў тым жа выглядзе.

Варта нагадаць, што маштабны праект рэстаўрацыі каралеўскай рэзідэнцыі пачаўся ў 2017 годзе. Летась для наведвальнікаў былі адкрытыя музейныя экспазіцыі, у якіх адлюстраваны гісторыя забудовы Замкавай гары, жыццё старажытнага горада, эпоха праўлення Стэфана Баторыя. Дарэчы, адсюль у XII стагоддзі пачаў сваю гісторыю горад над Нёманам. У экспазіцыі сабраныя ў тым ліку артэфакты раскопак.

У пачатку гэтага года адкрылі тры новыя інтэр'ерныя залы — капліца, каралеўская лазня, пакоі чыноўніка. Алебастравая зала — першы этап рэканструкцыі Старога замка. Наступны пачнецца з аднаўлення самога палаца і флігеля. Этап будзе даволі складаны і працаёмкі. Пакуль работы па ім знаходзяцца ў праектнай стадыі. Але і гэта яшчэ не фінал. Будзе таксама трэцяя чарга, у рамках якой плануецца ўзвядзенне кутняй вежы, гаспадарчых пабудоў, адбудзецца кансервацыя Ніжняй царквы XII стагоддзя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# З ЧАШНІКАЎ — У ВЯЛІКІ СВЕТ

**Калі ў вас надарыцца вольная субота ці нядзеля — паспяшайцеся ў Чашнікі. Старадаўні гарадок на Віцебшчыне падасца вам больш адкрытым і зразумелым, калі вы пачняце падарожжа па ім і ваколіцах са знаёмства з рэпрадукцыямі старых паштовак.**

І перад вамі паўстане зусім іншая прастора — адметная сваімі вуліцамі і вулачкамі, з ракой Ула, на якой і знаходзяцца Чашнікі, з праваслаўнай царквою — такой, якой яна выглядала ў пачатку ХХ стагоддзя. Яшчэ і паромная пераправа на старой паштоўцы падкажа вам яркія дэталі з гаспадарчага жыцця гэтага за сотню (калі быць дакладнымі — за 95) кіламетраў ад Віцебска паселішча. Дарэчы, дабірацца можна і цягніком па лініі Орша — Лепель. Да чыгуначнай станцыі Чашнікі — яна за 3 км ад сённяшняй раённай сталіцы.



Чашнікі. Царква (былы касцёл). Пачатак ХХ ст.

У 1960-я гады нас тут яшчэ мог сустрэць касцёл Святога апостала Лукі. Знішчаны больш за паўвека назад. І ўсё менш сведкаў, якія памятаюць гэты архітэктурны помнік ужывую... А мураваны касцёл прастаяў у гарадку, ранейшым мястэчку, з канца XVIII стагоддзя, лічы, болей як паўтара стагоддзя. Выбудоўвалі яго ў 1779 — 1786 гады.

Самі ж Чашнікі ў XVI стагоддзі былі ў складзе Полацкага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Гаспадарылі тут князі Лукомскія. У Лівонскую вайну на правым беразе Улы па загадзе маскоўскага цара Івана IV пабудавалі Чашніцкую крэпасць, якая пазней зрабілася Чашніцкім замкам. У 1708 годзе замак спалілі. Уладарылі тут у розныя часіны Кішкі, Сапегі, Патоцкія, Валадковічы. У XVII стагоддзі мястэчка сфарміравалася як гандлёвы цэнтр. На галоўнай, гандлёвай, плошчы знаходзілася царква (з трыма званамі розных памераў). Ад плошчы радыяльна разыходзіліся тры дарогі — Іванская, да панскай сядзібы, Лукомская, да Лукомля, Цяпінская, да мястэчка Цяпіна. На Уле працавала прыстань. Да яе прыбывалі караблі з таварам купцоў. Мелася каля прыстані некалькі дзясяткаў складскіх збудаванняў. З часам нават судны-стругі будавалі ў Чашніках. У 1791 — 1793 гадах паселішча з'яўлялася цэнтрам Полацкага ваяводства. А з 1793 года Чашнікі — ужо ў складзе Расійскай імперыі... Мястэчка яшчэ больш пачало развівацца як суднаходны цэнтр. У 1797 годзе пад наглядам генерала Вітэ пачалося будаўніцтва Бярэзінскай воднай сістэмы. Местачкоўцы працавалі на будаўніцтве шлюзаў. Жыхары гарадка і ваколіц авалодвалі прафесіяй плытагонаў. У сярэдзіне ХІХ стагоддзя тут налічвалася каля дзвюх з паловай тысячы жыхароў, мноства з якіх былі высокапрафесійнымі лоцманамі. Наймаліся ўвесну на баркі і праводзілі іх па Дзвіне аж но да Рыгі.

Угледзьцеся ў чашніцкія ваколіцы... Красналукі з праваслаўнай царквою — на здымку пачатку ХХ стагоддзя. Іванск — з вонкава простым, але, па ўсім відаць, прыстойным сядзібным домам... Касцёл у Чарэях. Адна з паштовак дапаможа разгледзець і ўбранне ў Чарэйскім каталіцкім храме. А вось і сядзібны дом у Чарэях...

Заўсёды цікава, якіх знакамітых асоб выпеставаць можа такая выключна адметная працаздольнасцю сваіх жыхароў старонка... У Чашніках нарадзіўся беларускі паэт Янка Журба (1881 — 1964): у ранейшай вёсцы Купніна, якая цяпер знаходзіцца ў межах райцэнтра. Скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю, затым Глухаўскі настаўніцкі інстытут (у Чарнігаўскай губерні). Працаваў настаўнікам у гарадскіх і пачатковых вучылішчах ва Украіне, у Беларусі і Расіі. З 1934 года — у Мінску. Працаваў у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук БССР. З-за хваробы вачэй у 1937 годзе пакінуў работу, вярнуўся ў Чашнікі. Быў настаўнікам спеваў. Апошнія гады жыцця правёў у Полацку, жыў у сваякоў і ў манашак зачыненага на той час Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Пахаваны на Ксавер'еўскіх могілках у Полацку. Аўтар паэтычных зборнікаў «Заранкі» (1924), «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955), «Светлыя дні» (1959), «Ясныя шляхі» (1959), «Вершы» (1970), «Роднае» (1980), «Мая песня» (1984)... *«Я рос сярод красы прыроды, / Душу сваю з прыродай зліў; / І у шчасны час, і ў час нягоды / Яе заўсёды я любіў»* (з верша Янкі Журбы «Маё дзяцінства»).



Чарэя. Сядзібны дом. Пачатак ХХ ст.



Чашнікі. Паромны перавоз. Канец ХІХ ст.



Чашнікі. Малюнак Н. Орды. Сярэдзіна ХІХ ст.

Мне давялося быць знаёмым з яўрэйскім паэтам, перакладчыкам, публіцыстам, які пісаў на ідыш, беларускай і рускай мовах, Рыгорам Рэлесам (1913 — 2004), які таксама нарадзіўся ў Чашніках. Журналістыкай і літаратурай ён пачаў займацца яшчэ ў 1930-я гады. У Саюз пісьменнікаў быў прыняты ў 1936 годзе. Пасля быў выключаны. Затым адноўлены. Працаваў у газетах «Піянер Беларусі», пасля вызвалення Заходняй Беларусі — у Навагрудку на радыё. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў у газеце «Зорька», часопісе «Вожык». У 1948 — 1973 гг. настаўнічаў у Мінску. Пераважна — у вячэрніх школах рабочай моладзі. І працаваў як паэт, празаік, публіцыст. Выдаў кнігі апавяданняў «Сябры і знаёмыя», «За цеснымі партамі», «У родным куточку», аповесць «Праз цяжкі парог», іншыя творы. У 1961 годзе ў перакладзе Рыгора Барадуліна выйшла кніга вершаў Рыгора Рэлеса на беларускай мове — «Бяроза пад акном». У 1992 годзе разам з Юліяй Канэ Рыгор Львовіч уклаў кнігу прозы Шолам-Алейхема «Тэўе-малочнік». Калі я браў інтэрв'ю ў Рыгора Рэлеса, а было гэта звыш 20 гадоў таму, пісьменнік са светлым розумам, чыстымі вачыма расказваў мне і пра сваю прывязанасць да Чашнікаў, да памяці аб прашчурах з гэтай старажытнай старонкі... У Чашніках у 1863 годзе нарадзіўся яшчэ адзін яўрэйскі пісьменнік — Сямён Акімавіч Ан-скі. Парваўшы сувязь з яўрэйскім асяроддзем, ён зрабіўся ў юным узросце апантаным рэвалюцыянерам-народнікам. Неаднаразова яго арыштоўвалі, утрымлівалі ў астрозе. Працаваў шахцёрам на Екацярынаслаўскіх шахтах. Пачаў пісаць артыкулы з шахцёрскага быту і друкавацца з імі ў мясцовых газетах. Вандраваў па Германіі і Швейцарыі, працаваў ў пераплётнай майстэрні. Праз некаторы час напісаў кнігу «Нарысы народнай літаратуры». Па рэкамендацыі вядомага публіцыста Глеба Успенскага стаў асабістым сакратаром сацыёлага, народніка Пятра Лаўрова. Пад яго дыктоўку запісаў працы «Вопыт гісторыі думкі», «Перажыванні дагістарычнага перыяду», «Уводзіны ў гісторыю думкі». Стаў адным з заснавальнікаў Аграрна-сацыялістычнай лігі. Напісаў на ідыш верш «Клятва», які стаў «Марсэльезай яўрэйскіх рабочых». Займаўся этнаграфіяй, вывучаў быт і фальклор яўрэйскіх мястэчак. Праехаў і абследаваў больш чым 70 паселішчаў, запісаў вялікую колькасць казак, прымавак, песень. Сабраў велізарную колькасць дакументаў... Зрабіў каля 1500 фотаздымкаў. Над сістэматызацыяй сабраных матэрыялаў працаваў да канца свайго жыцця...



Красналукі. Царква Святога Духа. Пачатак ХХ ст.

Чашнікі — і радзіма даволі папулярнага савецкага, расійскага пісьменніка-фантаста Зіновія Юр'ева (1925 — 2020). Відаць, нехта са старэйшых пакаленняў, хто быў захоплены чытачом фантастычных твораў, памятае яго раман «Хуткія сны». А яшчэ такія творы, як «Дару вам памяць», «Далёкія родзічы», «Тонкі галасок безыменнай кветкі»... У рамане «Бэта Сем пры блізкім разглядзе» (1990) выступіў супраць ідэй сацыялізму. З 1952 года ўраджэнец Чашнікаў працаваў у часопісе «Крокодил».

А Чарэя, якую мы ўжо згадвалі, і якая ад Чашнікаў на адлегласці звыш 30 км, — радзіма французскага паэта Оскара дэ Любіча Мілаша (1877 — 1939), дзядзькі і настаўніка лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Чэслава Мілаша. З Чарэі — і легендарны савецкі ваеначальнік генерал арміі Яўген Піліпавіч Іваноўскі (1918 — 1991), які ў свой час камандаваў і войскамі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Герой Савецкага Саюза. У апошнія гады вайсковай службы — Галоўнакамандуючы Сухапутнымі войскамі СССР. У 1899 годзе ў Чарэі нарадзілася савецкі мікрабіёлаг Рахіль Драбкіна (памерла ў 1982 годзе)... Пра ўсіх гэтых знакамітых землякоў вы даведаецеся ў Чашніцкім гістарычным музеі. Варта толькі зазірнуць на вуліцу Савецкая, 71.

А будзеце мець больш часу на вандроўку ў Чашнікі і Чашніцкі край, то не абмініце і Новалукомль. Ад Чашнікаў — усяго 23 км. Добрага настрою вам дадасць і любаванне возерам Лукомскае, на правым беразе якога і размешчаны Новалукомль... Упэўнены, падарожны выхадны дзень марна не пройдзе.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

**Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «ГРОДНОЖИЛСТРОЙ», г. Гродно, ул. Суворова, 135, УНП 500013575 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов** (одним лотом)
Адрес: **Гродненская обл., г. Гродно, ул. Победы, 26**

**Производственная база** в составе: **механизированная мастерская** (здание специализир. иного назначения, инв. № 400/С-14075, 156,6 кв. м, составные части: холодная), **склад материалов** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ, инв. № 400/С-14175, 344,7 кв. м), **трансформаторная подстанция** (здание специализир. энергетики, инв. № 400/С-14176, 36,6 кв. м), **склад** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ, инв. № 400/С-14177, 262,3 кв. м), **склад баллонов** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ, инв. № 400/С-14179, 61,3 кв. м, составные части: рампа), **склад ГСМ** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ, инв. № 400/С-14180, 30,3 кв. м), **лабораторный корпус** (здание специализир. иного назначения, инв. № 400/С-14181, 85,4 кв. м), **здание администрации** (здание административно-хозяйственное, инв. № 400/С-14185, 1092,5 кв. м, составные части: покрытие проезда и благоустройство, водопров. сеть, канализац. сеть, наруж. газопровод, ограждения), **гаражи** (здание специализир. автомоб. транспорта, инв. № 400/С-14186, 377,3 кв. м), **подсобное помещение** (здание специализир. иного назначения, инв. № 400/С-14187, 1529,2 кв. м, составные части: навес), **кабельная линия напряжением 10 кВ** (сооружение специализир. энергетики, инв. № 400/С-59860, 471,3 кв. м).

***Сведения о земельных участках***:
1) пл. **2,0270 га** предоставлена продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания зданий и сооружений (ограничения (обременения): охранная зона электрических сетей, пл. 0,0878 га);
2) пл. **0,2397 га** предоставлена продавцу на праве аренды (срок действия: по 28.06.2070) для строительства и обслуживания склада материалов (ограничения (обременения): охранная зона электрических сетей, пл. 0,0838 га)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 849 311,88 бел. руб.**

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных** дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных** дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 11.00 28.08.2023.**<br>**Окончание торгов – 12.00 28.08.2023.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 25.08.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 212 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Продавец:** ОАО «Витебскоблавтотранс», 210601, г. Витебск, ул. С. Панковой, 1, тел.: +375 (212) 22-80-44, +375 (2132) 6-19-07.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 236/С-14256 общей площадью 479,0 кв. м, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39, на зем. участке с кадастровым № 222155200001000842 площадью 1,1032 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39 (право постоянного пользования). Целевое назначение зем. участка – для размещения объектов административного назначения.

**Нач. цена:** 140 331,10 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток:** 14 033,11 бел. руб.

**Лот № 2.** Кап. строение с инв. № 225/С-13397 общей площадью 676,0 кв. м, наименование – гараж на 16 мест, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39, на зем. участке с кадастровым № 222180290410000068 площадью 0,1182 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39 (право постоянного пользования). Целевое назначение зем. участка – для обслуживания гаража на 16 машино-мест.

**Нач. цена**: 99 655,42 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток:** 9 965,54 бел. руб.

